


ХТО ПАТРЭБНЫ НА ПРАЦУ Ў МІНСКУ? 6

ПРАДКАЗВАЕМ НАДВОР'Е ПА РАСЛІНАХ І НАСЯКОМЫХ 11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЛЮТАГА 2021 г. СЕРАДА № 25 (29394)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Мінулае пяцігоддзе ў беларускай культуры запомнілася рэстаўрацыяй знакавых аб'ектаў. Вынікам планамернай кансервацыі, аднаўлення, а таксама прыстасавання пад новыя функцыі помнікаў архітэктуры ў 2016—2020 гадах стала завяршэнне рэстаўрацыі і ўвядзенне ў гаспадарчы абарот больш чым 630 аб'ектаў матэрыяльнай спадчыны».*

# Першы ў хату – тата



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У студзені ў Ашмянах здалі ў эксплуатацыю дом для шматдзетных сем'яў на 36 кватэр. Пакрысе навасёлы пачынаюць абжываць свае кватэры. Віктар ВАШКЕВІЧ, які працуе кіроўцам у будаўнічай арганізацыі, бацька траіх дзяцей і ўладальнік новай трохпакаёвкі. Перад тым, як перавезці ў яе сям'ю, ён даводзіць да ладу гаспадарчыя справы. Па дарозе ў новую кватэру наш фотакарэспандэнт яго і сустрэў.

## КОРАТКА

- У Беларусі захваральнасць на туберкулёз за чатыры гады знізілася больш чым на 40 %.
- **У Гродне ўзнагародзілі студэнтаў-медыкаў за дапамогу ў барацьбе з каранавірусам.**
- Кабінет камп'ютарнай тамаграфіі запрацаваў у Кобрынскай райбальніцы.
- **«Мінсктранс» у першай палове 2021 года папоўніць парк на 150 тралейбусаў і 280 аўтобусаў.**
- У Беларусі выдадзены 900-тысячны ключ электроннага лічбавага подпісу.



- **Амаль восем тысяч пацярпелых з галалёднымі і халадовымі траўмамі зарэгістравана з пачатку года.**
- Каля тысячы зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб разгледзела транспартная інспекцыя Мінтранса ў 2020 годзе.
- **Прадпрыемства «Беллеспаперпрам» у 2020 годзе павялічыла экспарт прадукцыі на 5 %.**

ISSN 1990 — 763X
9 771990 763008 21025

Перспектыва

## Брэстчына: складальныя рэгіянальнай палітыкі



Фота Святланы КІСЛАЙ.

**На Брэстчыне, як і ў іншых рэгіёнах рэспублікі, актыўна абмяркоўваецца праграма развіцця краіны. Ад таго, як будуць працаваць усе галіны эканомікі, залежыць якасць жыцця і дабрабыт жыхароў гарадоў і вёсак. Пра вынікі работы апошніх гадоў і асноўныя кірункі развіцця, цікавыя праекты, рэгіянальныя праграмы «Звяздзе» расказаў намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый ГАРАДЗЕЦКІ.** СТАР. 5

ЖЫВІЦЕ ЎБЯСПЕЦЫ

## З ВОГНЕННАЙ ПАРАЙ

### Чаму гараць лазні?

**Жаданне многіх людзей — магчымасць мець уласную лазню. Але мала толькі займець прысядзібны ўчастак і грошы на яе пабудову. Паколькі ў лазні абавязкова ёсць печка або кацёл, то падчас іх няправільнай эксплуатацыі можна застацца і без каштоўнага будынка.**

Зусім нядаўні выпадак адбыўся на тэрыторыі Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі ў аграгарадку Ратамка Мінскага раёна. Гарэла парыльнае памяшканне лазні. Пацярпелых няма, хіба толькі папсавалася аздабленне.

Але не заўжды гэтыя выпадкі заканчваюцца добра. У ліпені мінулага года загарэлася лазня ў вёсцы Гаішча Валожынскага раёна. Там спаў 62-гадовы гаспадар дома. З атручэннем прадуктамі гарэння яго даставілі ў мясцовую бальніцу. А вось урон пажар нанёс істотны — знішчаны дах, пашкоджаны сцены. Ды і плошча, на якой пагуляў агонь, немалая — 30 квадратных метраў.

Аналагічнае здарэнне адбылося ў красавіку і ў Маладзечанскім раёне.

Дык чаму ж гараць лазні? Пра гэта мы запыталіся ў **афіцыйнага прадстаўніка Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Анастасіі ШВАЙБОВІЧ.**

— Год ад году колькасць узгаранняў застаецца прыкладна аднолькавай. Калі ў 2019-м на тэрыторыі прысталічнага рэгіёна былі адзначаны 192 пажары ў лазнях, то летась — 185. А за сёлетні студзень такіх выпадкаў адбылося ўжо 19. Пераважная прычына пажараў у лазнях — парушэнне правілаў пажарнай бяспекі пры эксплуатацыі печаў і цеплагенерыруючых агрэгатаў. Каля траціны ўзгаранняў узнікаюць праз няправільную іх устаноўку і мантаж. СТАР. 11

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У гэтай пяцігодцы Мінск трэба зрабіць ўзорна ідэальным»

## Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка гаварыў падчас даклада старшыні Мінскага гарвыканкама Уладзіміра Кухарава

**Мэр Мінска на новай пасадзе адпрацаваў толькі квартал, але гэты перыяд быў настолькі складаны, што яго можна параўнаць з двума гадамі дзейнасці. «Але вы чалавек не новы, добра Мінск ведаеце і таму прызначаліся на гэтую пасаду», — сказаў кіраўнік краіны.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што хоча пачуць ад мэра сталіцы, якія асабіста ён і гарвыканкам вынеслі ўрокі з мінулага года, асабліва другой яго паловы. У тым ліку Прэзідэнта цікавіў урон, нанесены гораду падчас несанкцыянаваных акцый, і спаганнне гэтага ўрону з вінаватых. «Тут спуску ніякага не павінна быць», — падкрэсліў ён.

Па яго словах, бягучы год таксама няпросты, цяжкі, з улікам асабліва знешніх фактараў. «Нам трэба што б там ні было вытрымаць гэты год», — заўважыў кіраўнік краіны.

Закрануў Прэзідэнт і надзённы камунальны аспект, а менавіта расчыстку вуліц у сталіцы пасля снегападу. Нечаканасцю для яго стала: людзі скардзяцца ў інтэрнэце, што не пасяваюць камунальнікі расчышчаць вуліцы. «Вуліцы мы расчышчаем, пасяваем, а вось завулкі, двары, амаль што падход да дома і пад'езда кожнага чалавека... Канешне, нас можна крытыкаваць, але ў такія надзвычайныя моманты трэба, каб людзі самі падключаліся да ўборкі», — заявіў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што работу ў вялікім горадзе па ачыстцы ад снегу неабходна арганізаваць. «Гэта не ў вёсцы, што выйшаў на вуліцу, каля плота стаіць лапата — пачысціў, не трэба нікога арганізоўваць. Чалавек самаарганізаваны ў вёсцы. Гэта вельмі вялікая работа. У горадзе людзей неабходна арганізаваць. Калі неабходна, дапамагчы інструментам і дакладна людзям сказаць: слухайце, сітуацыя такая — гэта тэрыторыя за вамі, а гэту мы будзем чысціць», — выказаўся Аляксандр Лукашэнка. Ён упэўнены — людзі з задавальненнем падключацца да работы, але неабходна іх арганізаваць.

Падчас даклада Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу мэра на канкрэтныя пытанні. У прыватнасці, на аб'екты нерухомасці ў раёне плошчы Якуба Коласа, пра якія ўжо вялася размова на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. «Гэта ж цэнтр горада, і парадак там трэба наводзіць. Ёсць і іншыя такія пункты. Вось мы былі на «Гарызонце». Там жа велізарная колькасць квадратных метраў, тысячы, нерухомасці ў цэнтры горада, і добрай нерухомасці. Асучасніць трэба, у парадак прывесці. Вось у такіх месцах трэба наводзіць парадак», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён папярэдзіў Уладзіміра Кухарава, што няпроста будзе працаваць у Мінску з-за ціску на ўлады сталіцы. «Гэта наш горад, беларускі горад, гэта цывілізаваны горад, цэнтр Еўропы. Дарослыя людзі, хто разумее ў горадабудаўніцтве, прыязджаюць — ахкаюць, вохкаюць, што і жыць можна нармальна, і адпачыць можна. Мінск бандытамі не падзелены на кавалкі, — сказаў Прэзідэнт. — І водная роўнядзь, і паркі, і жыллё, і для працы месцы ёсць — чысты прыгожы горад. І нам яго не проста трэба захаваць, пачынаючы з гэтага года. У гэтай пяцігодцы Мінск трэба зрабіць ўзорна ідэальным».

Як расказаў Уладзімір Кухараў, аснова развіцця Мінска — гэта яго эканоміка. Таму Мінгарвыканкам самую сур'ёзную ўвагу ўдзяляе развіццю эканамічнага складніка горада. «Забяспечана павышэнне ўзроўню рэальнай заработнай платы практычна на 10 %, яна сёння складае 1782 рублі. Забяспечаны рост выручкі ад рэалізацыі прадукцыі на 9 %, рост прыбытку ад рэалізацыі прадукцыі павялічыўся ў нас на 17 %. Мы лічым, што гэта для прадпрыемстваў вельмі добры вынік у той эканамічнай сітуацыі, якая была ў свеце. Рэнтабельнасць складае 9 %. Акрамя таго, забяспечана выкананне ключавых паказчыкаў па будаўніцтве жылля», — паведаміў сталічны мэр.

**Марыя ДАДАЛКА.**

• **У тэму**

### ШКОДА, НАНЕСЕНАЯ СТАЛІЦЫ ПАДЧАС ПРАТЭСТАЎ, АЦЭНЕНА Ў 1,25 МІЛЬЁНА РУБЛЁЎ

**Пра гэта журналістам пасля даклада паведаміў старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ. Па яго словах, сёння спагнана з грамадзян, якія ўчынілі злачынства, ужо 980 тысяч рублёў. «Работа працягваецца. Тыя людзі, што нанеслі шкоду камунікацыям, дваровым тэрыторыям, выяўлены, прыцягваюцца да адказнасці, і з іх спаганяюцца сумы, якія выстаўлены з боку камунальных службаў горада Мінска», — расказаў мэр.**

На яго думку, выкарыстанне адміністрацыйных, крымінальных пакаранняў дасць зразумець людзям неправамернасць іх паводзінаў.

«Тое, што ёсць у горадзе Мінску, — праца мільёнаў людзей, што пражываюць тут, клапоцяцца, любяць свой горад, робяць шмат, каб ён заўсёды быў прыгожы, утульны, камфортны для пражывання і гасцей сталіцы. Калі хтосьці сваімі дэструктыўнымі дзеяннямі разбурае зробленае, — гэта, у першую чаргу, іх характарызуе як безадказных людзей, якія да горада і яго жыццядзейнасці адносяцца адмоўна. Таму мы прымем самыя сур'ёзныя меры, каб далей у нас такіх выпадкаў болей не было», — запэўніў мэр Мінска.

Гаворачы пра ўборку снегу, Уладзімір Кухараў адзначыў: было вядома, што будзе снегапад, і камунальныя службы былі падрыхтаваны. «З раніцы каля 750 адзінак тэхнікі працуюць (над расчысткай снегу ў Мінску. — «**Зв.**»). Так, ёсць цяжкасці з тым, што ў час пік шмат машын знаходзіцца ў горадзе Мінску. Яны не садзейнічаюць таму, каб калоны тэхнікі, што расчышчаюць снег, працавалі ў поўным аб'ёме. Але ў цяперашні момант сітуацыя знаходзіцца ў рабочым рэжыме. Фактычна, кальцавая дарога, праспекты і магістральныя вуліцы знаходзяцца ў працоўным стане», — канстатаваў мэр.

Ён заклікаў гараджан прыняць удзел у расчыстцы дваровых тэрыторый, бо вялікая колькасць прыпаркаваных там машын перашкаджае рабоце тэхнікі. Інвентаром камунальныя службы гатовы забяспечыць.

# МНОГАЕ З ТАГО, ПРА ШТО ХАЦЕЛАСЯ Б ДАВЕДАЦЦА

**Новы афіцыйны інтэрнэт-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прадставіла прэс-служба беларускага лідара 9 лютага. Ён распрацаваны айчыннымі IT-спецыялістамі, інфармуе БелТА.**



Пры стварэнні сайта выкарыстоўваўся сучасны міжнародны вопыт, найлепшыя айчынныя напрацоўкі і тэхнічныя рашэнні ў сферы вэб-дызайну.

Структура сайта кардынальна перапрацавана. З'явіліся новыя старонкі і раздзелы. Навігацыя па абноўленым партале зручная і інтуітыўна зразумелая. Пошукавая сістэма таксама была ўдасканалена і значна пашырана для зручнасці наведвальнікаў.

Сайт адаптаваны пад розныя прылады, у прыватнасці пад смартфоны і планшэты. Для спрошчанага доступу ў карыстальніка ёсць магчымасць непасрэдна на партале спампаваць «іконку» і пасля заходзіць на сайт, зрабіўшы ўсяго адзін клік. Новая версія таксама падтрымлівае перадавую тэхналогію «прагрэсіўны вэб-дадатак» (PWA, progressive web app), якая дазваляе атрымліваць доступ да партала больш надзейна і хутка.

Партал створаны з выкарыстаннем трох моўных версій: рускай, беларускай і англійскай. Як і раней, даступная версія для слабавідушчых карыстальнікаў.

Што датычыцца кантэнту і напаўнення сайта, традыцыйна ў яго аснове — інфармацыя аб бягучай дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На галоўнай старонцы ў фармаце календара карыстальнік можа азнаёміцца з самымі актуальнымі падзеямі рабочага тыдня кіраўніка дзяржавы — наглядна і максімальна аператыўна. І вядома, як і раней, на прэзідэнцкім сайце будуць размешчаны найбольш важныя нарматыўныя прававыя акты, якія прымаюцца кіраўніком дзяржавы.

На новым сайце сфарміраваны пасапраўднаму ўнікальны архіў — найважнейшыя падзеі з рабочага графіка кіраўніка дзяржавы, пачынаючы з 1994 года. Многія з размешчаных матэрыялаў раней не публікаваліся.

Яшчэ адно важнае абнаўленне: тэхнічныя характарыстыкі сайта з гэтага часу дазваляюць арганізоўваць прамыя трансляцыі найважнейшых мерапрыемстваў з удзелам кіраўніка дзяржавы.

Асаблівы акцэнт на партале зроблены на мультымедыйны складнік. Значна больш аб'ёмны стаў раздзел «Беларусь». Ён разлічаны перш за ўсё на замежнага карыстальніка, у якога будзе магчымасць у сканцэнтраваным выглядзе атрымаць інфармацыю аб нашай краіне па шырокім спектры кірункаў.

Адно з найбольш яркіх абнаўленняў — раздзел «Прэзідэнт без гальштука». У ім сабраны самыя эксклюзіўныя матэрыялы. Карыстальніку гэты раздзел дазволіць бліжэй пазнаёміцца з жыццём беларускага лідара па-за строгімі пратакольнымі рамкамі. Тут сабраны матэрыялы аб Прэзідэнце, яго сям'і і малой радзіме, мноства іншай разнастайнай інфармацыі — ад спартыўных захапленняў і прысядзібнай гаспадаркі да нефармальных мерапрыемстваў, у якіх браў удзел Прэзідэнт.

Яшчэ адной цікавінкай партала стаў віртуальны тур па Палацы Незалежнасці. Не выходзячы з дому, наведвальнік сайта мае ўнікальную магчымасць трапіць у рэзідэнцыю Прэзідэнта і ўбачыць залы, у якіх праходзяць шматлікія міжнародныя мерапрыемствы і сустрэчы, абмяркоўваюцца актуальныя пытанні і прымаюцца найважнейшыя рашэнні ўнутранага парадку дня.

Для зваротнай сувязі з грамадзянамі захавае сваю пазіцыю на сайце раздзел «Ліст Прэзідэнту», з дапамогай якога ўсе жадаючыя могуць накіраваць на імя кіраўніка дзяржавы свае звароты і прапановы.

Распрацоўшчыкі сайта не абышлі ўвагай і маленькіх грамадзян краіны. Раздзел «Прэзідэнт — дзецям» змяшчае пазнавальную адаптаваную інфармацыю аб дзяржаўным ладзе, сімволіцы, Канстытуцыі, гісторыі Беларусі і правах дзіцяці. Тут жа юным карыстальнікам падкажуць, як стаць Прэзідэнтам.

Варта адзначыць, што пры стварэнні новага інтэрнэт-партала не выкарыстоўвалася бюджэтнае фінансаванне. Работы праведзены за кошт сродкаў Парка высокіх тэхналогій.

Ва ўрадзе

# ЛЕТА ПАСЯРОД ЗІМЫ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Узбекістан Насірджанам ЮСУПАВЫМ, які завяршае сваю місію ў нашай краіне.**

Кіраўнік дыпламатычнай місіі Узбекістана на сустрэчы адзначыў, што напрыканцы яго службы ў Мінску сюды, нарэшце, прыйшла сапраўдная зіма.

«Галоўнае, што ў нас у двухбаковых адносінах не зіма, і нават не вясна ўжо, а, напэўна, паўнацэннае лета», — заважыў на гэта Раман Галоўчанка і дадаў, што, па словах яго ўзбекскага калегі, ва Узбекістане вялікі рэзананс мела нядаўняя сустрэча Насірджана Юсупава з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам.

Беларускі прэм'ер лічыць, што кіраўніку ўзбекскай дыпламатычнай місіі ў Мінску ёсць чым ганарыцца. За мінулы год тавараабарот паміж дзвюма краінамі вырас на 17 % і склаў 280 мільёнаў долараў, беларускі экспарт ва Узбекістан павялічыўся на 26 % і дасягнуў 238 мільёнаў долараў. У лістападзе 2018 года, праз 9 месяцаў пасля прызначэння Насірджана Юсупава ў Мінск, кіраўнікамі ўрадаў дзвюх краін была зацверджана дарожная карта па развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Узбекістанам. Раман Галоўчанка пацікавіўся ў дыпламата, што яшчэ, на яго думку, можна зрабіць у найбліжэйшы час для таго, каб адносіны паміж краінамі вывесці на якасна новы ўзровень.

Кіраўнік місіі падзякаваў прэм'еру за знойдзены для сустрэчы час і сказаў, што для яго вялікі гонар тое, як у Беларусі аднесліся да яго дзейнасці: аўдыенцыя з Прэзідэнтам, гутарка са спікерам верхняй палаты парламента і гэта сустрэча сведчаць пра вельмі сур'ёзныя адносіны кіраўніцтва краіны да сувязяў з Узбекістанам, лічыць дыпламат.

«Для мяне вялікі гонар быць першым паслом Узбекістана», — адзначыў Насірджан Юсупаў. Ён прызнаўся, што вынікі работы ўзбекскага пасольства перасягнулі ўсе яго чаканні, у першую чаргу, яго прыемна ўразіў беларускі народ і яго стаўленне да Узбекістана. Менавіта ў гэтым ён бачыць галоўны рэсурс для нарошчвання супрацоўніцтва паміж дзяржавамі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Нашы кнігі

# АДКРЫЦЬ КІТАЙ З НОВЫХ РАКУРСАЎ

**«Развенчваць міфы і разбураць стэрэатыпы» — такі слоган можна выкарыстаць для новай кнігі Інесы ПЛЕСКАЧЭЎСКАЙ «Як разгадаць Кітай», якая выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда». Яе прэзентавалі на сустрэчы з журналістамі напярэдадні XXVIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, якая пройдзе з 18 да 21 лютага.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

— Прыемна, што чарговую навінку мы прадстаўляем перад кніжнай выстаўкай. І калі гаварыць аб працэсах кнігавыдавецтва, то ў многім поспех залежыць ад таго, якія аўтары працуюць з выдавецтвам. Мы вельмі ўдзячныя Інесе Плескачэўскай за плённае супрацоўніцтва. Магчыма, на працягу доўгіх гадоў усе чыталі яе матэрыялы не толькі з Кітая, але і з еўрапейскіх краін. У іх адлюстроўваюцца як палітычныя, так і грамадскія, сацыяльныя падзеі замежжа. Паказваецца жыццё з розных бакоў, што заўсёды цікавіць чытачоў незалежна ад іх палітычнай, адукацыйнай падрыхтоўкі, і такую цікавасць можна прасачыць не толькі па гэтай кнізе, але і, напрыклад, па выданні «Без «жалезнай заслоны», — адзначыў падчас прэзентацыі **дырэктар — галоўны рэдактар «Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.** — Што датычыцца кніжкі «Як разгадаць Кітай», то яна яскрава спалучае ў сабе і спробу правесці сур'ёзныя рэчы, якія характарызуюць Кітай, і памкненне тлумачыць усё простай мовай і на простых прыкладах.

Аснову кнігі Інесы Плескачэўскай «Як разгадаць Кітай» складаюць аўтарскія калонкі і артыкулы, што выходзілі на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня» на працягу 12 гадоў, калі аўтар жыла ў Кітаі. З іх можна даведацца, напрыклад, як паводзіць сябе кітайцы перад шлюбам альбо як адносяцца да аўтамабіляў, і многае іншае. Выданне дае чытачам магчымасць спазнаць краіну з двух ракурсаў — праз бачанне тых, хто прыязджае туды як госць, і з пазіцыі ўспрымання кітайцамі самих сябе. Кніга поўнаколерная, і ў ёй, акрамя цікавых аповедаў, змешчана таксама шмат фотаздымкаў Міхаіла Пяньеўскага, што дазваляе літаральна ўбачыць тое, аб чым расказвае аўтар.

— Роўна праз тыдзень, 16 лютага, споўніцца 15 гадоў, як з'явілася мая калонка пра Кітай у газеце. Тады яна друкаваліся пад назвай «Лісты з Пекіна», а сёння ўжо выходзіць як «Лісты Інесы Плескачэўскай». Калі доўгія гады я пісала ў Кітаі свае калонкі, атрымлівала шмат водгукаў ад чытачоў, яны нават рабілі выразкі з газет. Таму гэтая кніга, можна сказаць, адказ на запыты чытачоў, цяпер усё сабрана пад адной вокладкай, — кажа Інеса Плескачэўская. — Кніга складаецца з двух вялікіх раздзелаў «Мы ў іх» і «Яны ў сябе». Першы — пра ўласны вопыт знаходжання ў гэтай краіне, маё яе спазнаванне і спроба разгадаць. Вельмі цікавы занятак, які мае шмат падводных камянёў. Шмат рэчаў цябе здзіўляе, а ёсць тое, што можа раздражняць, шакіраваць у пэўнай ступені, але калі падыходзіш з адкрытай свядомасцю, то ўсё спрашчаецца. Таму што самае галоўнае ў Кітаі, як і ў любой краіне, якую вы спрабуеце зразумець, не ісці з гатовымі ацэнкамі, не спрабаваць ацэньваць па шкале «добра-дрэнна», якая ёсць у вашай галаве. Трэба проста прыехаць і імкнуцца зразумець, чаму тут так адбываецца. А другая частка кнігі распавядае пра саміх кітайцаў і іх уласнае стаўленне да сваіх краіны, культуры, традыцый, гісторыі.

Трэба адзначыць, што кніга «Як разгадаць Кітай» — ужо трэцяе выданне аўтаркі, якое ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Раней тут з'явіліся кнігі «Гістарычныя прагулкі з Францыскам Скарынам», «Без «жалезнай заслоны». І сёлета супрацоўніцтва працягнецца. Як падзялілася Інеса Плескачэўская, цяпер яна працуе над кнігай пра вядомага беларускага харэографа Валянціна Елізар'ева. А што да навінкі, то яе ўжо можна набыць у кніжных крамах краіны. Таксама пры жаданні завітайце на прэзентацыю кнігі на кніжнай выстаўцы 20 лютага, дзе зможаце не толькі набыць выданні аўтара з аўтографам, але і асабіста сустрэцца з творцай. Добрая навіна ёсць і для жыхароў Віцебска. Там 16 лютага ў Цэнтры сучаснага мастацтва адкрыецца вялікая фотаэкспазіцыя «Неразгаданы Кітай», а пасля адкрыцця выстаўкі пройдзе вялікая прэзентацыя кнігі.

**Алена ДРАПКО.**

Педагагічная майстэрня

# САМАЯ КЛАСНАЯ КЛАСНАЯ ГАДЗІНА!

**Конкурс на найлепшы змест класнай гадзіны абвясціла праграма «Настаўнік для Беларусі».**

Яе куратары ўпэўнены ў тым, што кожная хвіліна, праведзеная ў школе, павінна прыносіць карысць. І гэта датычыцца не толькі ўрокаў і перапынкаў. Конкурс «Самая класная класная гадзіна» збірае ў сваю скарбонку геніяльныя ідэі, як прарадзіцца гэтым часам максімальна эфектыўна. Конкурсныя работы могуць быць у выглядзе эсэ, сцэнарыя, метадычнай распрацоўкі, відэа і іншых формах падачы. Усяго прадугледжана сем намінацый:

— «Класная гадзіна ў пачатковай школе»: ідэі для вучняў 1—4 класаў.

— «Класная гадзіна для навучэнцаў 5—9 класаў».

— «Класная гадзіна для старшакласнікаў»: ідэі для навучэнцаў 10—11 класаў.

— «Разам з бацькамі»: ідэі для сумеснага з сем'ямі вучняў мерапрыемства.

— «Найлепшая класная гадзіна аб фінансах».

— «Погляд збоку»: ідэі ад удзельнікаў, якія не працуюць у школах.

— «Навыкі 21 стагоддзя». Удзельнічаць у гэтай намінацыі могуць не толькі педагогі.

Падаць заяўку на конкурс трэба на сайце http://teach4.by/klassnyi-chas да 20 лютага ўключна.

Пры ацэньванні работ будуць брацца пад увагу актуальнасць ідэі, якасць апісання, магчымасці выкарыстання і маштабавання. Плануецца, што пазней гэтыя ідэі будуць выкарыстоўваць для правядзення класных гадзін не толькі ў школах-партнёрах праграмы «Настаўнік для Беларусі», а таксама ў рэгіянальных і гарадскіх школах па ўсёй краіне. Аўтары найлепшых работ атрымаюць прызы ад спонсараў і партнёраў конкурсу, сярод якіх БПС-Ашчадбанк, фонд «Новая школа», SKLAD, EPAM, Vizor Games, анлайн-гіпермаркет 21vek.by і Інстытут Гётэ.

Цяпер у рэгіёнах краіны выкладае ўжо больш за 30 «настаўнікаў для Беларусі» (9 удзельнікаў першага набору і 22 — другога), праграма ахапіла літаральна ўсю краіну (19 школ-партнёраў). У гэтым годзе фонд «Новая школа» плануе набраць новых «настаўнікаў для Беларусі», каб пашырыць сваю прысутнасць у рэгіёнах і стварыць унікальныя адукацыйныя магчымасці для большай колькасці дзяцей. Другая хваля набору працягнецца да 28 лютага 2021-га ўключна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Еўрапейскія газавыя сховішчы запоўнены менш чым напалову



Паводле даных Gas Infrastructure Europe, запасы газу ў падземных газавых сховішчах (ПГС) Еўропы скараціліся да ўзроўню ніжэй за 50 %, паведаміла ТАСС. Па стане на 6 лютага з еўрапейскіх ПГС адабрана 47 млрд «кубоў» газу, што на 13 % больш, чым было запампавана ў сховішчы пры падрыхтоўцы да гэтай зімы, і ўжо на 8 % перавышае адпампоўку за ўсю мінулую зіму. Раней паведамлялася, што ў Нідэрландах кошт газу склаў 284 долары за тысячу кубаметраў, у той час як у ліпені мінулага года газ у краіне прадаваўся па 70 долараў за тысячу кубоў. У Іспаніі газ даражэў да 660 долараў за тысячу кубаметраў, што стала абсалютным гістарычным рэкордам для краіны. Яшчэ мацней цэны на газ выраслі ў Азіі: спотавыя каціроўкі на хабе JKM падскочылі ў 10 разоў і ў пачатку гэтага тыдня перавысілі 1000 долараў за тысячу кубаметраў.

### У ААН зафіксавалі рэкордны скачок сусветных цэн на прадукты харчавання




Сусветныя цэны на прадукты харчавання ў студзені рэзка выраслі і дасягнулі максімуму з ліпеня 2014 года, паведамілі ў Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (FAO). Індэкс харчовых цэн у студзені склаў 113,3 пункта, што на 4,3 % вышэй, чым у снежні 2020 года. Збожжавыя ў параўнанні са снежнем падаражэлі на 7,1 %, чаму спрыяла рэзкае павышэнне міжнародных цэн на кукурузу (на 11,2 %). Індэкс цэн на раслінны алей у студзені вырас на 5,8 % і дасягнуў самага высокага ўзроўню з мая 2012 года. Цукар у параўнанні са снежнем падаражэў на 8,1 %. Індэкс цэн на малочную прадукцыю вырас на 1,6 %, што тлумачыцца актыўнымі закупкамі з боку Кітая напярэдадні святкавання Новага года па месяцовым календары на фоне сезоннага скарачэння экспартных паставак з Новай Зеландыі.

### У Францыі распрацавалі прыладу, якая дазваляе правесці тэст на ковід з дапамогай смартфона



Навукоўцы Універсітэта Ліль распрацавалі прыладу пад назвай Cordial, якая дазваляе чалавеку самастойна правесці тэст на каранавірус з дапамогай мабільнага тэлефона, паведаміў тэлеканал BFM. Апарат сваім знешнім выглядам нагадвае звычайную «флэшку», яго датчык рэагуе на спайк-пратэіны, якімі акружаны COVID-19. Для выкарыстання агрэгат неабходна ўставіць у раз'ём мабільнай прылады, затым змясціць на тэставую паласу невялікую колькасць слізі, узятай з насаглоткі. Навукоўцы сцвярджаюць, што вынік тэста на новы тып інфекцыі можа быць ужо праз 10 хвілін, апарат выводзіць даныя аналізу на экран тэлефона. Паводле інфармацыі распрацоўшчыкаў, прылада выяўляе вірус з дакладнасцю да 90 працэнтаў.

Навука

# Інавацыйная інфраструктура для малочнай галіны

**У Інстытуце мяса-малочнай прамысловасці НАН Беларусі адбылося адкрыццё пілотнага інавацыйнага аб'екта «Навукова-эксперыментальная вытворчасць сухіх малочных прадуктаў і інгрэдыентаў».**

У рамках праекта створана не толькі вопытна-прамысловая пляцоўка для апрабацыі вынікаў навуковых даследаванняў, але і малатанажная вытворчасць спецыялізаваных сухіх малочных прадуктаў (у тым ліку для дзяцей, хворых на фенілкетанурыю), сухіх сумесяў для марожанага (у тым ліку з паніжаным утрыманнем цукру), імпартазамяшчальных харчовых дабавак для мясной і малочнай прамысловасці.

Акрамя таго, інавацыйная база будзе выкарыстоўвацца для практычнага навучання спецыялістаў малакаперапрацоўчых прадпрыемстваў, навучэнцаў каледжаў і студэнтаў ВНУ аграрнага профілю сучасным працэсам мембраннага канцэнтравання, электрадыялізу і сушкі малочнай сыравіны. Такім чынам запуск і функцыянаванне новага аб'екта ў РУП «Інстытут мяса-малочнай прамысловасці» забяспечыць інтэграцыю трох ключавых аспектаў у развіцці інавацыйнай эканомікі: навукі, вытворчасці і адукацыі.

Дадзены аб'ект у якасці аб'екта інавацыйнай інфраструктуры накіраваны на навуковае суправаджэнне экспартаарыентаванай малочнай галіны і з'яўляецца ўкладам НАН Беларусі ў дасягненне запланаваных параметраў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады. Асноўныя палажэнні Праграмы будуць разглежаны на VI Усебеларускім народным сходзе 11—12 лютага 2021 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Здарэнне

## Канфіскавалі больш за тону шкламыйнай вадкасці

**Супрацоўнікі раённых аддзелаў па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі РУУС Мінска падчас праверачных мерапрыемстваў у розных раёнах сталіцы выявілі нелегальных збытчыкаў шкламыйнай вадкасці.**

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, устаноўлена, што жыхары Мінска і Мінскага раёна ажыццяўлялі скупку «амывайкі» на адным з рынкаў з мэтай збыту на МКАД. Са слоў затрыманых, вадкасць яны набывалі па 2,6 — 5 рублёў за бутэльку, а прадавалі па 5 — 10 рублёў. Набытую прадукцыю захоўвалі ў сябе ў аўтамабілях. Супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі ў парушальнікаў каля 1140 літраў вадкасці. Агульны кошт выяўленага склаў каля 1000 рублёў.

Вядома, што некаторыя з затрыманых раней ужо прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

У дачыненні да грамадзян па факце незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці складзены адміністрацыйныя пратаколы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



VI УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

# Больш самастойнасці і ініцыятывы

**Гэта будзе спрыяць вырашэнню задач у будучую пяцігодку, перакананы старшыня Бабруйскага гарвыканкама Аляксандр СТУДНЕЎ.**



Бабруйск з'яўляецца адным з 11 гарадоў з колькасцю насельніцтва больш за 80 тысяч, дзе была прыменена паскораная комплексная праграма па развіцці горада на 2019—2020 гады. Стаяла задача за кошт развіцця эканомікі рэгіёна скараціць разрыў у якасці жыцця насельніцтва.

— Распрацаваная ў рамках выканання даручэнняў Прэзідэнта праграма ўключала ў сябе больш чым 300 мерапрыемстваў ва ўсіх сферах жыцця горада, — адзначыў Аляксандр Студнеў. — Бабруйск пацвердзіў статус індустрыяльнага цэнтра, захаваўшы свае пазіцыі ў прамысловай сферы. Нягледзячы на знешнія выклікі і абмежаванні, у нас атрымалася забяспечыць даволі эфектыўнае завяршэнне пяцігодкі і ўпэўнена падысці да новага этапу развіцця. Выгаднае эканоміка-геаграфічнае становішча, зручная лагістыка, развіты транспартна-прамысловы комплекс і прадпрымальніцкі сектар — усё гэта было задзейнічана для вырашэння задач. Быў узяты курс на інавацыі. Выпуск новай прадукцыі павялічыўся ў 1,5 раза. Вялася работа над захаваннем і развіццём пазіцый у знешнім гандлі. Прадпрыемствы горада пастаўлялі прадукцыю ў 70 краін. У цэлым за мінулую пяцігодку колькасць экспартных рынкаў павялічылася больш чым на сотню. Экспарт тавараў і паслуг бабруйскіх прадпрыемстваў перавысіў імпарт у два разы. Узраслі выручка, прыбытак ад рэалізацыі, рэнтабельнасць продажаў. Уласныя даходы бюджэту горада перасягнулі 103 %. У нас атрымалася самае важнае — захаваць працоўныя калектывы і забяспечыць грамадска-палітычную стабільнасць.

Дасягнуты належны ўзровень сацыяльнай абароненасці насельніцтва. Сярэдняя заработная плата ў параўнанні з 2019-м узрасла ў 1,2 раза і дасягнула ў снежні мінулага года планкі ў 1166 рублёў. Значна палепшылася сацыяльная інфраструктура. Толькі за два апошнія гады Бабруйск увёў у эксплуатацыю шэсць буйных сацыяльных аб'ектаў, 137 тысяч квадратных метраў жылля, 21 гандлёвы аб'ект. Арыентацыя рабілася на комплексны падыход у будаўніцтве. Побач з жыллём адразу ж узводзяцца ўстановы адукацыі, аб'екты сферы паслуг. Так былі пабудаваны школа і дзіцячы садок з басейнам.

Адчувальна абноўлена база медыцынскіх устаноў. Летась завершана рэканструкцыя дзіцячай бальніцы, дзе праходзяць лячэнне дзеці не толькі з Бабруйска, але і з чатырох суседніх раёнаў. Устаноўка новага сучаснага абсталявання, набыццё машын хуткай медыцынскай дапамогі, у тым ліку рэанімабіля, дазволілі аператыўна спрацаваць у перыяд складанай эпідсітуацыі.

Яшчэ адным ключавым фактарам развіцця рэгіёна з'яўляецца падтрымка сем'яў з дзецьмі. За пяць гадоў колькасць шматдзетных сем'яў у горадзе ўзрасла ўдвая. Знамянальна, што амаль 80 % наведвальнікаў новага дзіцячага садка, які адкрыўся летась, са шматдзетных сем'яў.

Якія задачы на будучае ставіць гарадское кіраўніцтва?

— Пакуль што не па ўсіх кірунках дасягнуты патрабуемы вынік, — адзначае Аляксандр Студнеў. — Для ліквідацыі дыспрапорцый на дыялогавых пляцоўках былі выпрацаваны сумесныя прапановы па далейшым павышэнні эфектыўнасці работы. Гэтыя пазіцыі знайшлі сваё адлюстраванне ў Праекце праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на новую пяцігодку. Перспектывы — гэта кваліфікаваны кадравы склад, камфортныя ўмовы працы і жыцця, развітая інфраструктура, рост інвестыцый і новыя вытворчасці. Практыка рэалізацыі ў горадзе комплекснага плана на 2019—2020 гады пацвярджае мэтазгоднасць і далейшага зацвярджэння праграмных дакументаў на сярэднетэрміновы перыяд. І сёння, беручы пад увагу дыферэнцыяванасць і шматфактарнасць падыходаў да развіцця рэгіёнаў, неабходна павысіць самастойнасць канкрэтнага горада або раёна, у залежнасці ад спецыялізацыі і патэнцыялу. Гэта дазволіць эфектыўна спраўляцца з эканамічнымі рызыкамі, выкарыстоўваючы рэгіянальны інтарэс.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «Прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Расіі заўсёды застануцца вернымі дзецьмі сваёй радзімы»

**Сяргей КАНДЫБОВІЧ — асоба вельмі цікавая і living разнабаковая.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Сяргей КАНДЫБОВІЧ — асоба вельмі цікавая і разнабаковая. Заслужаны дзеяч навукі Расіі, акадэмік Расійскай акадэміі адукацыі, доктар псіхалагічных навук, прафесар, чатырохразовы лаўрэат дзяржаўных прэмій Расійскай Федэрацыі, ён мае непарыўныя сувязі з нашай краінай, бо сам нарадзіўся ў Мінску. У гэтыя дні Сяргей Кандыбовіч чарговы раз завітаў у родны горад з нагоды правядзення Усебеларускага народнага сходу, на які яго як старшыню Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі», якая аб'ядноўвае 71 грамадскую арганізацыю беларускай дыяспары ў 35 рэгіёнах Расіі, запрасілі ў якасці госця. Напярэдадні народнага форуму карэспандэнт «Звязды» пагутарыла з Сяргеем Львовічам пра яго чаканні ад гэтай падзеі, пра тое, як нашы суайчыннікі, што жывуць у Расіі, ставяцца да палітычнай сітуацыі ў краіне і на чым грунтуецца патэнцыял беларускага грамадства.**

***— Сяргей Львовіч, у Беларусі ваша аўтаномія мае цесныя зносіны з многімі міністэрствамі — інфармацыі, культуры, адукацыі і апаратам упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў... Як выбудоўвалі дзейнасць арганізацыі летась, калі ўвесь свет закрыўся з-за пандэміі і ці атрымалася дасягнуць нейкіх поспехаў у справе супрацоўніцтва?***

— Мінулы год, я думаю, быў самы складаны ў найноўшай гісторыі ў сусветным маштабе. Але разам з тым трэба шукаць і ў гэтай сітуацыі пазітыўныя моманты. Спачатку было складана, але потым фармат дыстанцыйных мерапрыемстваў дапамог. Мы шмат чаму навучыліся, асвоілі рэжым анлайн-сустрэч.

Не будзем забываць, што мінулы год быў юбілейны — святкавалі 75-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мы вельмі рыхтаваліся да яго і выдалі кнігу «Республика-Партизанка. К 75-летию Победы в Великой Отечественной войне», дзе сабраны ўспаміны ўдзельнікаў партызанскага руху. Падпісаны экземпляр мы праз беларускае пасольства перадалі Прэзідэнту Беларусі, калі ён завітаў на Парад у Маскву. Варта адзначыць, што непасрэдны прыярытэт нашай арганізацыі — святанні, звязаныя з патрыятычнымі праектамі. У нас, мабыць, ва ўсіх у генетычным кодзе зашыты рэчы гераічнай гісторыі Беларусі, улічваючы, што яна — адна з краін, найбольш пацярпелых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

А яшчэ 2020 год нас шмат чаму навучыў, і ў першую чаргу — берагчы сябе і тых, хто побач. Год быў трывожны і з-за падзей на маёй гістарычнай радзіме.

***— Калі вы ўспомнілі пра складаную грамадска-палітычную сітуацыю ў Беларусі, запытаю: як беларусы, што жывуць у Расіі, успрынялі гэтыя падзеі?***

— Дарэчы, сёння ў Расіі пражываюць 550 тысяч грамадзян Расійскай Федэрацыі, якія пры апошнім перапісе насельніцтва назвалі сябе беларусамі па нацыянальнасці. Таму сітуацыя ў Беларусі, нас не толькі непакоіць — гэта наш боль, штодзённае хваляванне. Калі пачаліся падзеі ў Беларусі, у нашу арганізацыю сталі звяртацца калегі з іншых нацыянальна-культурных аўтаномій. Яны вельмі перажывалі за нас і нашу радзіму. Вельмі прыемна, што словы падтрымкі гучалі і гучаць, бо беларусы заўсёды адчувалі павагу і любоў да сабе з боку іншых нацыянальнасцяў.

Інфармацыю пра Беларусь мы атрымліваем не толькі праз сродкі масавай камунікацыі, але і на бытавым узроўні. Паведамленні пра падзеі разглядаем не аднабока, а можам аб'ектыўна адсачыць з розных крыніц. Таксама маем зносіны з нашымі сябрамі, роднымі, што жывуць у Беларусі.

***— Напэўна, у членаў вашай арганізацыі погляды на палітычную сітуацыю адрозніваюцца? Ці атрымліваецца знаходзіць ім агульную мову?***

— У нас быў прыклад падзей ва Украіне. Яны прывялі да трагедый сем'яў, якія пачалі распадацца з-за разнастайнасці поглядаў на адны і тыя ж падзеі... Скажу, што ў перыяд самых вострых падзей у жніўні—верасні да мяне як кіраўніка арганізацыі і да нашага актыву было шмат запытаў пра неабходнасць выступіць з нейкай заявай. Прычым гэтыя патрабаванні зыходзілі з розных бакоў. Я вельмі ўдзячны нашаму актыву, што яны знайшлі ў сабе мудрасць перажыць гэтыя эмацыянальныя хвалі. Яны нідзе не выступілі з заявамі, якія маглі трактавацца як палітычныя. Нягледзячы на тое, што мы вельмі хвалюемся за радзіму, у нас тут родныя, сябры, магілы продкаў, усё-такі разумеем: мы — грамадзяне іншай дзяржавы. Хай самай блізкай, з адной крывяноснай сістэмай, але мы з іншай краіны. А нашы пэўныя дзеянні, выказванні могуць трактавацца як умяшальніцтва ў справы незалежнай дзяржавы.

Час зараз вельмі складаны. Шмат кансалідаваных сіл прымяняюць намаганні супраць нашых дзяржаў і нашага разумення светаўладкавання. Усё гэта накладваецца на пандэмічныя справы і эканамічны крызіс. Я вельмі спадзяюся, што мудрасць нашых народаў дасць магчымасць узяць верх над гэтым становішчам рэчаў.

***— Гэта ўжо трэці для вас Усебеларускі народны сход, дзе маеце статус госця. Якія ўражанні засталіся ад мінулых форумаў?***

— Шчыра скажу, што на УНС адчуваеш атмасферу агульнага свята: сустрэчы з сябрамі, новыя знаёмствы. Немалаважным з'яўляецца факт, што ўдзельнікі сходу ўсведамляюць сваю прыналежнасць да вялікай падзеі. Такі фармат узаемадзеяння ўлады і народа — справаздача аб працы і дасягненнях, указанне на недапрацоўкі і план на пяцігадовую перспектыву. УНС пакідае магчымасць кулуарна паслухаць глыбінны аналіз сітуацыі ў краіне. Чалавек за трыбунай выступае не ад свайго імя, а ад імя калектыву, калег, пэўнага сегмента грамадства, сектара народнай гаспадаркі і такім чынам дзеліцца з іншымі сваімі думкамі.

Ад нашага аб'яднання прыехала прадстаўнічая дэлегацыя. Але я не стаў бы казаць пра нас як дэлегацыю, бо кожны член аўтаноміі мае індывідуальнае запрашэнне ад аргкамітэта УНС. Павінна было прыехаць сем чалавек, але Алег Навіцкі зараз рыхтуецца да трэцяга касмічнага палёту. У сувязі з рэгламентам гэтай падрыхтоўкі і з-за пандэміі ковіду, ён мусіў бы праходзіць потым двухтыднёвы каранцін, што выклікала б складанасці...

***— Ведаю, што ў вас запланавана выступленне падчас сходу. Падзяліцеся, якія ідэі, думкі хочаце данесці да слухачоў?***

— Я хацеў бы сказаць з трыбуны, што беларуская дыяспара ў Расійскай Федэрацыі — вельмі патрэбныя людзі і Расіі, і Беларусі. Ніколі сыны і дочкі Беларусі не падвядуць сваю гістарычную радзіму. Несумненна, мы перажываем за падзеі ў Беларусі. Разам з тым мы бачым некаторыя пункты, якія можна больш рэльефна разглядзець ва ўзаемаадносінах нашых краін. Я адзначыў бы, што прадстаўнікі беларускай дыяспары ў Расійскай Федэрацыі заўсёды застануцца вернымі дзецьмі сваёй радзімы.

***— Вы ў адной з нядаўніх гутарак у СМІ выказалі ўпэўненасць, што ў беларускага грамадства ёсць вялізны патэнцыял. У чым вы бачыце гэты патэнцыял?***

— У кожнага народа ёсць рэсурсы для развіцця. Што датычыцца патэнцыялу беларускага народа, то, я мяркую, ён асноўваецца на генетычным кодзе, усходнеславянскім братэрстве, трапяткім стаўленні да чалавечага жыцця, супрацьстаянні чужым каштоўнасцям. Патэнцыял таксама грунтуецца на высокім узроўні адукаванасці і культуры, гэта самабытнасць і годнасць нацыі. Беларусы — адна з нацый, якая ніколі ні перад кім не схілялася і не схіліцца.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Брэстчына: складальныя рэгіянальнай палітыкі

## ПАДМУРАК ДЛЯ ПРАГРАМЫ

Вядома, што будаваць планы далейшага развіцця можна толькі абапіраючыся на падмурак дасягнутага. Таму ёсць сэнс нагадаць некаторыя вынікі работы эканомікі Брэстчыны. Па выніках 2019 года Брэсцкая вобласць прызнана адным з пераможцаў сярод абласцей і горада Мінска за дасягненне высокіх паказчыкаў у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця і занесена на Рэспубліканскую дошку Гонару. З улікам складаных умоў гаспадарання ў 2020 годзе валавы рэгіянальны прадукт павялічыўся ў адносінах да 2015-га на 8,7 працэнта (летась склаў 13,9 мільярда рублёў), і гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у краіне.

Аб'ём прамысловай вытворчасці вырас за пяцігодку на 22,7 працэнта. Асноўным сегментам гэтай галіны ў нас з'яўляецца перапрацоўчая прамысловасць, і перш за ўсё, вытворчасць прадуктаў харчавання. Актыўна развіваюцца і карыстаюцца попытам на ўнутраных і міжнародных рынках пазнавальныя брэнды нашага рэгіёна: «Санта Брэмар», «Савушкін прадукт», «Брэсцкія традыцыі» ды іншыя.

За пяць гадоў толькі прадпрыемствамі канцэрна «Брэстмясамалпрам» рэалізавана інвестыцыйных праектаў на суму больш за 150 мільёнаў рублёў. Як вынік — першае месца ў краіне па аб'ёмах экспарту сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання.

Высокімі тэмпамі ў папярэдняй пяцігодцы развівалася і сельская гаспадарка. Вобласць сёння на першым месцы ў Беларусі па прадукцыйнасці дойнага статку і прывагах свіней, на другім — па прывагах буйной рагатай жывёлы. Вытворчасць малака за ўказаны перыяд павялічана амаль на трэць, надоі дасягнулі амаль 6,5 тысячы кілаграмаў.

Актыўна развіваецца і знешні гандаль. Экспарт тавараў вырас амаль ў 1,6 раза, паслуг — у паўтара раза. Калі ў 2015 годзе прадукцыя пастаўлялася ў 82 краіны свету, то летась ужо ў 106 краін. За пяцігадовы перыяд у вобласць паступіла каля 320 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый.

## ДАКЛАДНАЕ І АРГАНІЧНАЕ ЗЕМЛЯРОБСТВА

Разам з тым застаецца шэраг пытанняў, якія стрымліваюць устойлівае і збалансаванае развіццё вобласці. На вырашэнне гэтых задач, забеспячэнне якасна новага ўзроўню і ўстойлівай траекторыі збалансаванага сацыяльна-эканамічнага развіцця, стварэнне камфортнага і бяспечнага асяродку пражывання, дастойных даходаў будзе накіравана работа органаў кіравання ў наступным пяцігоддзі. Для гэтага будзе працягнута работа па фарміраванні канкурэнтаздольнага прамысловага і аграрнага комплексаў, арыентаваных на стварэнне высокапрадукцыйных рабочых месцаў, павелічэнне выпуску навукаёмістай, адпаведнай сусветным стандартам прадукцыі; нарошчванне экспарту, прыцягненне замежных інвестыцый, далейшае развіццё малога бізнесу.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)


На будоўлі новага мікрараёна ў Брэсце.

Эканамічны патэнцыял вобласці фарміруюць ключавыя пункты росту. На першай пазіцыі нашага аграрнага рэгіёна стаіць сельская гаспадарка. Дасягнуць прагрэсу ў раслінаводстве дапаможа ўдасканаленне структуры пасяўных плошчаў, выкарыстанне найбольш інтэнсіўных сартоў і гібрыдаў. Сёння як аб самым надзённым мы гаворым аб элементах сістэмы дакладнага земляробства, а таксама развіцця арганічнага земляробства. Апошнім у вобласці займаюцца дзве фермерскія гаспадаркі «Фартунаагра» і «АграФерма» і адна асабістая дапаможная гаспадарка на плошчы 200 гектараў. Ужо летась яны вырасцілі 30 тон садовых суніц, 130 тон бульбы, 52 тоны бабовых культур, 78 тон капусты, 10 тон агародніны. З улікам пацяплення будуць нарошчвацца новыя віды прадукцыі: у нас добра растуць кавуны, вінаград, арэхі. У жывёлагадоўлі будзе прадоўжана работа па мадэрнізацыі як абсталявання і памяшканняў, так і тэхналогій, асаблівая ўвага аддаецца селекцыйнай і племянной рабоце.

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Ухіл на мадэрнізацыю бачыцца галоўным у справе развіцця прамысловасці. Нашы перапрацоўчыя прадпрыемствы заваявалі аўтарытэт у свеце высокай якасцю прадукцыі. Важна крочыць у нагу з прагрэсам. Сведчаннем таму — будучая мадэрнізацыя вытворчасці сыроў на філіяле ААТ «Савушкін прадукт» у Баранавічах і на ААТ «Кобрынскі масларобна-сыраробны завод».

Далейшае развіццё мэблевай прамысловасці не абмяжоўваецца праектамі вядомых гігантаў «Пінскдрэў», «Івацэвічыдрэў», заяўляюць аб сабе і меншыя па аб'ёмах вытворцы, такія, напрыклад, як ТАА «Паліполь Мэбля Бел» па вытворчасці мяккай мэблі. У машынабудаванні запланавана рэалізацыя шэрагу праектаў, напрыклад, укараненне высокапрадукцыйнага тэхналагічнага працэсу вытворчасці адлівак павышанай дакладнасці з высокатрывалага шэрага чыгуну на Баранавіцкім станкабудаўнічым заводзе, асваенне вытворчасці прэсаў з пашыранымі тэхнічнымі магчымасцямі на заводзе «Кузлітмаш» у Пінску. Рэалізацыя інвестпраектаў таксама запланавана на Баранавіцкім аўтаагрэгатным заводзе, на САЛЕА-Кобрын і іншых прадпрыемствах.

## КІТАЙСКІ РЫНАК І ПРАРЫЎ У ЛАГІСТЫЦЫ

Работа па актывізацыі знешняга гандлю застаецца ў прыярытэце на новую пяцігодку. Стратэгічным рынкам для вобласці становіцца кітайскі. Летась экспартныя пастаўкі ў КНР выраслі ў 2,3 раза і склалі 72 мільёны долараў. Пашырыць асартымент экспартных паставак у Паднябесную плануе прадпрыемства «Санта Брэмар». Праяўлена цікавасць кітайскіх спажыўцоў да кандытарскіх вырабаў брэсцкіх прадпрыемстваў «Універсал-люкс» і «Першая шакаладная кампанія». Птушкафабрыка «Дружба» заключыла дагавор з кітайскімі кампаніямі на пастаўку прадукцыі з птушкі. Магчымасць выхаду на рынак Паднябеснай прапрацоўваюць такія вытворцы, як «Белавежскія далікатэсы», Бярозаўскі камбікормавы завод, Бярозаўскі мясакансервавы камбінат.

Выгаднае геаграфічнае становішча рэгіёна дыктуе патрэбу далейшага развіцця транспартнай лагістыкі. У 2019 годзе была завершана мадэрнізацыя кантэйнернага тэрмінала станцыі Брэст-Паўночны з павелічэннем яго перапрацоўчай магчымасці ў паўтара раза. А зараз вядзецца планаванне новага тэрмінала з абсталяваннем дзвюх еўракаляін і дзвюх шырокіх (усходніх) каляін у Камянецкім раёне, побач будзе пашыраны патэнцыял кампаніі «Захадтрансэкспедыцыя» па перавалцы звадкаваных вуглевадародаў. У Пінску пад лагістычны цэнтр холдынгавай кампаніі «Пінскдрэў» плануецца рэканструкцыя 75 тысяч квадратных метраў будынкаў.

## ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ ПАРТФЕЛЬ ДЛЯ РАЗУМНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Па праграме «Інавацыйнае развіццё Брэсцкай вобласці» за пяцігодку плануецца давесці ўдзельную вагу інавацыйна-актыўных арганізацый апрацоўчай прамысловасці да 35 працэнтаў. Далейшая работа Брэсцкага навукова-тэхналагічнага парка накіравана на стварэнне ўмоў для высокатэхналагічных вытворчасцяў і ўкараненне ў вытворчы працэс вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці. У найбліжэйшыя гады плануецца набыць комплекс абсталявання, які дазволіць арганізаваць дробнасерыйны выпуск прадукцыі. Працягваюцца стартапмерапрыемствы для малога інавацыйнага прадпрымальніцтва. У абласным цэнтры плануецца рэалізаваць кластарную ініцыятыву па ўкараненні тэхналогіі разумнай вытворчасці (3D-друк, інтэграцыі, воблачныя рашэнні і іншае). Усё гэта прыйдзе на канкрэтныя заводы і фабрыкі, нават у невялікія сельгаспрадпрыемствы.

А каб пералічанае атрымалася, патрэбны эфектыўныя інвестыцыі. Разам з рэгіёнамі аблвыканкам сфарміраваў інвестыцыйны партфель з 322 праектаў на 4,8 мільярда рублёў з тых, што ўжо рэалізуюцца, альбо запланаваныя да рэалізацыі ў 2021—2025 гадах. Яны прадугледжваюць стварэнне новых высокатэхналагічных вытворчасцяў, мадэрнізацыю і развіццё дзеючых прадпрыемстваў, у тым ліку з укараненнем сучасных інавацыйных тэхналогій. Для прыцягнення прамых замежных інвестыцый распрацавана каля сотні праектаў і ідэй, прапануецца 146 свабодных вытворчых пляцовак пад стварэнне новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў, у тым ліку 73 зямельныя ўчасткі.

Перспектыўным выглядае праект па здабычы і перапрацоўцы базальту і туфу ў Пінскім раёне. Інвестыцыйную прывабнасць, несумненна, мае ідэя вытворчасці віскознай ніці з новага віду светлагорскай прадукцыі — цэлюлознай віскозы.

У сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі плануецца ажыццявіць шэраг праектаў за кошт сродкаў міжнародных фінансавых арганізацый. Гаворка ідзе пра рэканструкцыю ачышчальных збудаванняў у Іванаве і Ляхавічах, рэканструкцыю водазабораў у Ганцавічах і Пінскім раёне, рэканструкцыю сістэмы водазабеспячэння і водаадвода ў Бярозе.

## ПРАЕКТЫ ДЛЯ ГЛЫБІНКІ І ЦЫРКУЛЯРНАЯ ЭКАНОМІКА

Прыйшоў час актыўна развіваць глыбінку, рабіць прывабнымі для жыцця, работы, бізнесу тэрыторыі за межамі ваколіц вялікіх гарадоў. З улікам патэнцыялу, які маецца, запланавана стварэнне двух кластараў. Першы задуманы ў сферы біятэхналогій і «зялёнай» эканомікі. Яго ядро складуць Палескі дзяржаўны ўніверсітэт і тэхнапарк «Палессе». Другі — мэблевы кластар з удзелам прадпрыемстваў вобласці. На абодва кластары будзе працаваць Біятэхналагічны цэнтр пры Палескім універсітэце, які мяркуецца стварыць.


Брэсцкі электралямпавы завод.

Асаблівая ўвага цяпер аддаецца раёнам з больш нізкім узроўнем развіцця і сельскім тэрыторыям. Развіццё іх эканомікі прадугледжваецца на падставе мясцовых рэсурсаў, індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, развіцця сферы паслуг, прасоўвання ўнікальных мясцовых брэндаў. У аддаленым Ганцавіцкім раёне неўзабаве з'явіцца буйная вытворчасць лекавых сродкаў на падставе рэкамбінантных тэхналогій і фракцыянавання плазмы крыві. На прадпрыемстве «Экзон» у Драгічынскім раёне будзе ўзведзены новы цэх па вытворчасці лекаў. У Маларыце працягнецца мадэрнізацыя абсталявання па разліве пюрэ і сокаў для дзіцячага харчавання на тутэйшым гарадаўтваральным прадпрыемстве — кансервавааграгароднінасушыльным камбінаце. На Давыд-Гарадоцкім электрамеханічным заводзе плануецца асвоіць вытворчасць пластыкавых кантэйнераў для збору цвёрдых камунальных адходаў.

І яшчэ, вельмі важнай складальнай рэгіянальнай палітыкі становіцца развіццё гарадоў і пасёлкаў на аснове разумных тэхналогій і прынцыпаў зялёнага горадабудаўніцтва з павышэннем эфектыўнасці выкарыстання рэсурсаў і паляпшэння якасці асяроддзя пражывання. Дарэчы, Брэсцкая вобласць выбрана пілотнай для адпрацоўкі механізма кіравання рэгіянальнымі структурнымі пераўтварэннямі ў кантэксце цыркулярнай эканомікі. Цыркулярная эканоміка — гэта новая рэсурсаэфектыўная мадэль, эканоміка інавацый. Пераход на яе азначае новыя тэхналогіі, новыя формы вядзення бізнесу. Праект праграмы цыркулярнай эканомікі ўжо распрацаваны.

## САЦЫЯЛЬНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ

У будучым пяцігоддзі застаецца сацыяльная накіраванасць эканамічнай палітыкі. Будзе ўзведзены новы медыцынскі комплекс у Брэсце. Капітальныя рамонт, рэканструкцыя, мадэрнізацыя чакаюць медыцынскія ўстановы ў абласным цэнтры, Баранавічах, Ганцавічах, Драгічыне, Лунінцы, Пінску, Маларыце. Працягнецца развіццё інфраструктуры сістэмы адукацыі. Будуць уведзены ў эксплуатацыю дашкольныя ўстановы, школы-садкі ў Брэсце, Баранавічах, Пінску, Жабінцы, Кобрыне, Століне, у вобласці пабудуюць чатыры новыя школы.

Вынікам рэалізацыі пазначаных кірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна павінен стаць рост даходаў насельніцтва і заработнай платы. Плануецца, што да 2025 года яна складзе 1600 рублёў, што ў паўтара раза больш за ўзровень мінулага года.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

# НА АДНАГО БЕСПРАЦОЎНАГА — 21 ВАКАНСІЯ

## Як наймальнікі заахвочваюць работнікаў і чаму ўтварыўся дысбаланс на сталічным рынку працы?

**Як пандэмія адбілася на рынку працы? Чаму сёння цяжка задаволіць кадравы попыт наймальнікаў у Мінску? Як атрымалася, што на сталічных прамысловых прадпрыемствах абвастрылася пытанне старэння кадраў і з чым яны сутыкнуцца праз некалькі гадоў? Як сёння прамысловыя гіганты заахвочваюць маладых спецыялістаў? На базе ўпраўлення па занятасці камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама была арганізавана дыялогавая пляцоўка ў межах абмеркавання Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гады.**

Удзельнікі размаўлялі пра ўмовы на рынку працы ў Мінску, баланс попыту і прапановы, забеспячэнне буйных вытворчых прамысловых прадпрыемстваў рабочымі кадрамі. Прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, службы занятасці, наймальнікаў, сферы адукацыі, якія адказваюць за падрыхтоўку рабочых кадраў, і прыватных кадравых агенцтваў падзяліліся сваімі меркаваннямі і прапановамі.

— Мінулы год быў спецыфічны — усе краіны працавалі ва ўмовах пандэміі. І яна накладвала абмежаванні на эканоміку і жыццядзейнасць насельніцтва. Але тыя меры, якія прымаліся з боку дзяржавы па недапушчэнні скарачэння кадраў, захаванні калектываў і іх падтрымцы (указы Прэзідэнта №№ 143, 178 і 179), дазволілі без сур'ёзных наступстваў для рынку працы закончыць 2020 год, — адзначыў **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ.** — Аб'ёмы вымушанай няпоўнай занятасці да мая дасягнулі піка, але затым пайшлі на спад, а да канца года вярнуліся да сярэдніх значэнняў, якія былі ў папярэднія гады. Сістэма дзяржорганаў, што адказваюць за занятасць, спрацавала надзвычай. Мы выканалі ўсе пастаўленыя ў галіне сацыяльнай занятасці ў 2020 годзе і дастойна справіліся з пандэміяй у дачыненні да рынку працы.

Намеснік міністра падкрэсліў, што з мінулага года дзейнічаюць нормы па дыстанцыйнай рабоце, замацаваныя ў Працоўным кодэксе. І суб'екты гаспадарання, каб захаваць калектывы, прымянялі дыстанцыйную форму. У першую чаргу, фінансавы і IT-сектар, банкі працавалі «на адлаенцы». Некаторыя арганізацыі і сёння працягваюць выкарыстоўваць такую форму, бо такім чынам з меншымі затратамі на ўтрыманне офіса і іншыя выгоды можна выконваць тыя ж задачы.

— Мінск — той рэгіён, які найбольш актыўна развіваецца, тут самая вялікая колькасць вакансій, а ўзровень беспрацоўя і колькасць беспрацоўных найменшыя ў адносінах да іншых рэгіёнаў. У Мінску па выніках 2020 года створана найбольшая колькасць новых рабочых месцаў — трэць ад усіх па краіне, — рэзюмаваў Андрэй Лабовіч.

Як адзначыла **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама — начальнік упраўлення занятасці насельніцтва Таццяна КУДЗЕВІЧ,** у 2020 годзе значна знізілася актыўнасць на рынку працы. Попыт арганізацый на рабочую сілу скараціўся амаль на 21 %. На 1 студзеня 2021 года наймальнікі заявілі ў службу занятасці 16 тысяч вакансій, 60 % з іх — па рабочых спецыяльнасцях. Пры гэтым арганізацыі замежнай формы ўласнасці знізілі попыт на рабочую сілу ў параўнанні з пачаткам мінулага года на 44 %, арганізацыі прыватнай формы ўласнасці — на 20 %, і на столькі ж — дзяржаўныя. Гэтыя працэсы выкліканы эпідэмічнай сітуацыяй.

Пры гэтым самае значнае скарачэнне попыту на кадры адбылося ў арганізацыях, якія аказваюць паслугі па часовым пражыванні і харчаванні, а таксама ў сферы адукацыі і адміністрацыйных паслуг. Найбольшую патрэбу ў кадрах на пачатак 2021 года выявілі арганізацыі прамысловасці, аховы здароўя і сацыяльных паслуг, будаўніцтва, гандлю і адукацыі.

Са скарачэннем попыту скараціўся і абарот рабочай сілы — ён склаў мінус 3,5 %. Пры гэтым абарот па звальненні работнікаў знізіўся на 1,3 %, а вось абарот па прыёме — на 5,8 %. Узровень замяшчэння звольненых кадраў знізіўся да 93,4 %. Найбольш нізкі паказчык замяшчэння кадраў па выніках года склаўся ў тых арганізацыях, дзеназіраліся праблемы, — гэта арганізацыі, якія ажыццяўляюць фінансава-страхавыя паслугі, прадпрыемствы ў сферы творчасці, спорту і адпачынку, а таксама арганізацыі, што аказваюць паслугі па часовым размяшчэнні і харчаванні.

На фоне ўплыву пандэміі найважнейшай задачай для наймальнікаў было захаванне працоўных калектываў. Для гэтага яны прымалі розныя меры, у тым ліку і часовы перавод у іншыя арганізацыі, і ўдзел у аплачваемых грамадскіх работах. Прадпрыемствы IT-сектара па магчымасці пераходзілі на дыстанцыйную работу, арганізацыі сферы турызму, гасцінічнага бізнесу, аб'екты грамадскага харчавання вымушаны былі спыняць сваю дзейнасць і прыём работнікаў. У гэтых сферах скараціўся попыт на рабочую сілу.

Таксама наймальнікі прымянялі рэжымы няпоўнай занятасці. Найбольшыя страты рабочага часу адзначаліся ў маі і чэрвені. Да 60 % усіх страт, звязаных з няпоўнай занятасцю, прыпадала на сферу паслуг. Але дзякуючы сацыяльнай адказнасці і падтрымцы горада росту беспрацоўя ў Мінску не адбылося.

— З 2016 года ў горадзе назіраецца тэндэнцыя да скарачэння колькасці беспрацоўных, канстатуе Таццяна Кудзевіч. — У 2020 годзе па садзейнічанне ў пошуку работы ў службу занятасці Мінска звярнулася больш чым 11 тысяч чалавек. Рэгістрацыя беспрацоўных знізілася на 14 % адносна 2019 года. Больш за чатыры тысячы чалавек атрымала статус беспрацоўных. Пры гэтым, калі параўноўваць з 2016 годам, то рэгістрацыя беспрацоўных знізілася ў чатыры разы.

Спецыяліст адзначыла, што сярод беспрацоўных паступова расла доля грамадзян, якія маюць патрэбу ў дадатковых гарантыях і сацыяльнай абароне: з 22 % у 2016 годзе да 42 % у 2020-м. Гэта асобы, якія не маюць работы больш за год (20 %), інваліды (15 %), грамадзяне, звольненыя ў выніку скасавання тэрміновага працоўнага дагавора, а таксама тыя, хто вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі.

За 2020 год пры садзейнічанні службы занятасці было працаўладкавана амаль восем тысяч грамадзян. На 1 студзеня гэтага года ў якасці беспрацоўных значыліся 272 чалавекі. Традыцыйна ўзровень зарэгістраваных беспрацоўных у сталіцы не перавышае 0,1 % ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва.

Таццяна Кудзевіч падкрэсліла, што колькасны і якасны склад беспрацоўных не можа цалкам задаволіць кадравую патрэбу наймальнікаў горада.

— Адной з праблем рынку працы з'яўляецца прафесійна-кваліфікацыйны дысбаланс. На аднаго зарэгістраванага беспрацоўнага прыходзіцца 21 вакансія. Наймальнікі не могуць знайсці кадры. Многія прадпрыемствы маюць патрэбу ў кваліфікаваных рабочых. У многім гэты дысбаланс абумоўлены выкарыстаннем кадраў не па профілі атрыманай адукацыі. Па даных даследавання дамашніх гаспадарак у 2019 годзе, кожны трэці выконваў работу, якая не адпавядае атрыманай ім кваліфікацыі. Сярод занятага насельніцтва з вышэйшай адукацыяй 30 % мела работу ніжэй за сваю кваліфікацыю ці па іншай спецыяльнасці. Сярод асоб з сярэдне-спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыяй гэты паказчык яшчэ больш высокі — 45 %. Работа не па спецыяльнасці для 11 % удзельнікаў даследавання з'ўлялася асноўнай прычынай пошуку вакансій.




> Служба занятасці прапануе беспрацоўным навучанне па 25 кірунках, прычым звыш 70 % — з гарантаваным працаўладкаваннем. Больш за 2,8 тысячы грамадзян праінфармавана пра такую магчымасць, але толькі 316 чалавек пагадзіліся на навучанне.

— Меры па падаўжэнні працоўнага ўзросту толькі часова спынілі скарачэнне працоўных рэсурсаў, абвастрыўшы пытанне старэння працоўных кадраў. На канец 2019 года ў арганізацыях горада было занята амаль 23 % работнікаў ва ўзросце, старэйшым за 55 гадоў. Гэта самы высокі паказчык узроставых работнікаў сярод рэгіёнаў. У сярэднім па рэспубліцы ён складае 20 %. Пры гэтым сярод рабочых кадраў доля такіх работнікаў дасягае 30 %, сярод служачых — 16 %, — звярнула ўвагу Таццяна Кудзевіч.

**Намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела кадраў Мінскага трактарнага завода Таццяна БАРОДЗІЧ** пагадзілася з наяўнасцю праблемы. Яна расказала, што 15 % калектыву прадпрыемства дасягнулі пенсійнага ўзросту, яшчэ 22 % работнікаў да пенсіі засталося менш чым тры гады. Пры гэтым штогод прадпрыемства працаўладкоўвае 50—60 выпускнікоў ВНУ і каля 360 маладых людзей з рабочымі спецыяльнасцямі.

— У нас ёсць недахоп кадраў, таму мы забіраем не найлепшых з лепшых, а ўсіх. З гэтых прычын за кожным маладым спецыялістам замацоўваецца настаўнік. Яму ўстанаўліваецца надбаўка ў памеры 15 % ад акладу. Матывуем і моладзь: калі ў выпускніка сярэдні бал дыплома вышэй, чым 8,04, ён атрымлівае надбаўку ў 25 % ад аклада. Першую надбаўку за стаж у нас, як правіла, атрымліваюць праз год, але маладым спецыялістам мы ўстанаўліваем яе адразу ў памеры 10 %. Калі малады чалавек працягвае вучыцца, ён мае 30 аплачаных дзён у год падчас сесіі. Выпускнікоў БНТУ з балам дыплома ад 8,04 мы адразу ўладкоўваем інжынерамі другой катэгорыі, а гэта дадатковыя 80 рублёў да аклада. Калі малады чалавек паказвае сябе з найлепшага боку, мы залічваем яго ў перспектыўны рэзерв, што дае права атрымаць яшчэ 10 % да акладу. У нас ёсць сем інтэрнатаў, як правіла, у пакоі жывуць па два чалавекі. Плата за месца складае каля 70 рублёў у месяц, — расказала Таццяна Бародзіч.

Нягледзячы на ўсе меры стымулявання, 30 % маладых людзей адразу пасля размеркавання звальняецца для службы ў войску, яшчэ 12 % — пасля адпрацоўкі абавязковага тэрміну.

**Рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ** адной з прычын такога кадравага голаду назваў дэмаграфічную сітуацыю — прафесійна-тэхнічным установам у апошнія гады не хапае абітурыентаў. **Дырэктар агенцтва па працаўладкаванні «Першае рашэнне» Інеса ЦІШКЕВІЧ** выказала меркаванне, што ўплывае і заробатная плата, часам ніжэйшая, чым у суседніх краінах.

**Алена КРАВЕЦ.**

Будзь у курсе!

# У ДУБАЙ РАЗАМ З «БЕЛАВІЯ»

**З 19 лютага авіякампанія «Белавія» пачынае ажыццяўленне рэгулярных прамых рэйсаў па маршруце Мінск — Дубай — Мінск. Палёты са сталіцы Беларусі будуць выконвацца два разы на тыдзень па аўторках з вылетам у 19.50 і прыбыццём у сераду ў 2.30 і па пятніцах з вылетам у 16.15 і прыбыццём у 22.55 у Міжнародны аэрапорт Дубай. Зваротныя рэйсы з Дубая плануецца ажыццяўляць па серадах з вылетам у 3.30 і прылётам у 8.40 і па пятніцах з вылетам у 23.55 і прылётам у суботу ў 5.05 у Нацыянальны аэрапорт Мінск. Час для ўсіх аэрапортаў названы мясцовы, паведамілі ў аіякампаніі.**

Мінімальны кошт авіябілетаў у адзін бок — ад 216 еўра (тарыф LIGHT — без багажу), уключаючы таксы і зборы, і ад 375 еўра (тарыф LIGHT — без багажу) — туды-назад. Квіткі ўжо даступныя ў продажы. З больш падрабязнай інфармацыяй можна азнаёміцца на сайце авіякампаніі belavia.by.

Пасажыры ў Дубай паляцяць на новым авіялайнеры Embraer 195-E2. Гэты тып самалёта можа пераадольваць далёкія адлегласці і перавозіць 125 пасажыраў у двухкласавай кампаноўцы: 9 месцаў у салоне бізнес-класа і 116 — у эканом-класе. Флот «Белавія» папоўніўся новым самалётам 23 снежня 2020 года. Авіякампанія стала сёмай у свеце з тых, якія лётаюць на паветраных судах Embraer другога пакалення. У сакавіку і красавіку чакаецца пастаўка яшчэ двух новых самалётаў дадзенага тыпу. Пры павелічэнні пасажырапатоку рэйсы ў Дубай могуць выконвацца на Boeing 737-800, разлічаным на 189 пасажыраў.

Пры рэгістрацыі на рэйс і па прыбыцці ў Дубай пасажырам неабходна будзе прад'явіць даведку з адмоўным вынікам ПЛР-тэсту на англійскай ці арабскай мове, атрыманую не раней за 72 гадзіны да вылету. Па прылёце пасажырам абавязаны прад'явіць медыцынскую страхоўку на ўвесь перыяд знаходжання ў ААЭ, якая пакрывае выдаткі на лячэнне ад каранавіруснай інфекцыі, запоўніць анкету аб стане здароўя. Некаторых пасажыраў могуць папрасіць здаць ПЛР-тэст у аэрапорце па прылёце ў Дубай і самаізаляваца да атрымання вынікаў тэсту. Усе пасажыры, якія прыбываюць у Дубай, павінны ўстанавіць мабільную праграму COVID-19 — DXB Smart App.

Нагадаем, што з 16 студзеня 2021 года грамадзяне Беларусі могуць уязджаць, выязджаць і ехаць транзітам праз тэрыторыю ААЭ, а таксама знаходзіцца на тэрыторыі ААЭ без віз (не больш за 90 дзён з даты ўезду). Такія ж умовы дзейнічаюць і для грамадзян ААЭ на тэрыторыі Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДА СТА ГАДОЎ ЖЫЦЬ БЕЗ СТАРАСЦІ

## Што ляжыць у аснове даўгалецця, абмеркавалі на дыялогавай пляцоўцы

**Больш як 80 чалавек сабрала Мінская абласная дыялогавая пляцоўка «Сіла дзяржавы ў адзінстве народа», якая прайшла ў Жодзіне. Прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама, абласной і органаў мясцовай улады, ветэранскіх арганізацый, пенсіянеры, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і працы, былыя ахвяры фашызму з усіх куткоў Міншчыны абмеркавалі пытанні ўдасканалення сацыяльнай падтрымкі і абслугоўвання пажылых людзей.**

### У адказе за бацькоў

— Мінская вобласць лідзіруе сярод іншых рэгіёнаў краіны па ахопе пенсіянераў, састарэлых рознымі сацыяльнымі паслугамі. Іх атрымлівае каля 22 тысяч пажылых людзей і інвалідаў у тэрытарыяльных цэнтрах і сацыяльных установах. Пастаянна ўкараняюцца новыя формы абслугоўвання адзінокіх. Напрыклад, вельмі запатрабаваная такая форма, як сумеснае сямейнае пражыванне. Гэта, калі чужая сям'я бярэ да сябе ў дом пажылога чалавека або інваліда і даглядае яго, — сказала **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Тамара КРАСОЎСКАЯ.** — Тыя, хто хоча жыць дома, але не ў сілах выконваць



ktzszmoik.gov.by

усе хатнія клопаты, карыстаюцца паслугамі сацыяльнага работніка. Чалавек таксама можа скарыстацца паслугамі сядзелкі або нянькі. Развіваецца і паслуга пажыццёвага ўтрымання пажылога чалавека або інваліда. Тыя, у каго ёсць ва ўласнасці жыллё, могуць заключыць такі дагавор па рашэнні мясцовых уладаў з просьбай, каб яго пажыццёва ўтрымлівалі стацыянарныя ўстановы. Або ён можа быць замацаваны ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання тэрытарыяльнага цэнтра.

Тамара Красоўская заклікала ўдзельнікаў да шчырай размовы, адкрытага дыялогу, каб яны выказалі свае прапановы, пажаданні, бачанне па ўдасканаленні сацыяльнага абслугоўвання пажылых.

І аўдыторыя жыва адгукнулася. Напрыклад, прысутных хвалюе пытанне ўзаемаадносін паміж бацькамі і дарослымі дзецьмі. Бацькі ўкладвалі ў іх выхаванне ўсю душу, адзявалі, кармілі, вучылі. Словам, з адказнасцю ставіліся да сваіх абавязкаў. А цяпер ім самім патрэбна дапамога. Але далёка не ўсе яе атрымліваюць. Многія дзеці лічаць, што клапаціцца аб састарэлых павінна дзяржава. Таму наспела неабходнасць вынесці пытанне на заканадаўчы ўзровень і прапісаць норму, што дзеці павінны несці адказнасць за сваіх пажылых і нямоглых бацькоў.

— Якія дадатковыя меры неабходныя па абслугоўванні дома для паляпшэння якасці жыцця пажылых грамадзян. Што неабходна зрабіць нашым сацыяльным установам, каб вам было больш камфортна? — звярнулася да ўдзельнікаў сустрэчы Тамара Красоўская.

Ветэран працы са Слуцка Галіна Уладзіславаўна расказала, што да яе, як грамадскай актывісткі, землякі часта звяртаюцца па наступным пытанні. Цяпер жанчыны выходзяць на пенсію ў 58 гадоў, а абслугоўвацца ў тэрытарыяльных цэнтрах маюць права з 60. «А калі жанчына хворая, здароўе не дазваляе займацца хатнімі справамі, хадзіць у краму. Якім чынам магчыма змяніць сітуацыю?», — хвалюе яе.

Сапраўды, пытанне заслугоўвае ўвагі, паколькі пенсійны ўзрост павышаецца. Думаю, у найбліжэйшы час вынесем пытанне на заканадаўчы ўзровень, рэзюмавала Тамара Красоўская.

Ніна Аляксееўна з Беразіна цікавілася, ці можна пашырыць пералік паслуг для старых, якія пражываюць у сем'ях. У многіх з іх сваякі ездзяць на работу ў Мінск, працуюць вахтавым метадам, рана выязджаюць з дому і позна вяртаюцца назад. Старыя людзі застаюцца адны. І далёка не ўсе могуць сябе абслужыць. Ёсць і нядобрасумленныя сем'і, дзе раўнадушна адносяцца да патрэб састарэлых.

Калі пажылому чалавеку не надта камфортна ў сям'і, ён можа некаторы час пажыць у сацыяльных установах. Ставіцца пытанне аб магчымым яго пражыванні два месяцы і больш. Сёння таксама пашыраецца пералік паслуг, якія сацыяльны работнік можа аказаць па запыце грамадзян.

Раіса Канстанцінаўна жыве ў аграгарадку Вязынь Вілейскага раёна. Сорак пяць гадоў выкладала дзецям гісторыю і беларускую мову, была дырэктарам мясцовай школы. «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва дапамагае пажылым людзям актыўна ўключацца ў грамадскае жыццё. Асабіста я ўдзячная яго работнікам, што асвоіла камп'ютар. Мы адукаваныя людзі. І хоць нарадзіліся ў сярэдзіне мінулага стагоддзя, павінны ісці ў нагу з часам. Карыстаемся кнопачнымі мабільнымі тэлефонамі, але хочацца, каб нам дапамаглі асвоіць новыя, сучасныя айфоны, смартфоны, каб можна было звязацца з дзецьмі, унукамі, якія жывуць у іншай мясцовасці. Не проста пагутарыць, пацікавіцца іх справамі, але паглядзець на іх, заглянуць у вочы, — выказала пажаданне жанчына.

### Школа валанцёраў

Многія пажылыя людзі наведваюць аддзяленне дзённага знаходжання тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання. Ім тут заўсёды цікава, бо ёсць дзе прымяніць свае здольнасці, таленты. Такія магчымасці дае ўдзел у музычных, танцавальных групах, гуртках па інтарэсах, дзе яны займаюцца шыццём, вышываннем, вязаннем, макрамэ, пляценнем розных вырабаў з саломкі. Але гэтыя гурткі платныя. Варта было б падумаць над тым, каб зрабіць іх бясплатнымі, а прадукцыю прадаваць і за выручаныя грошы набываць матэрыялы для работы. Гучала і такая прапанова.

Як паказала сустрэча, пажылыя людзі ўжо не тыя, што былі гадоў 20—30 таму. Яны не хочуць сядзець дома, удзельнічаюць у розных мерапрыемствах, мастацкай самадзейнасці, шматлікіх грамадскіх аб'яднаннях па інтарэсах. Напрыклад, Софія Кот, якая наведвае аддзяленне дзённага знаходжання Смалявіцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання, прывезла на форум выстаўку сваіх работ. «Мне 82 гады, але не развітваюся са сваім хобі — вяжу шыдэлкам, вышываю карціны. Атрымліваю ад гэтага асалоду, што падтрымлівае інтарэс да жыцця. А гэта залог даўгалецця», — кажа Софія Андрэеўна.

— Софія Андрэеўна вельмі неравнадушны, няўрымслівы чалавек, яна бывае на ўсіх нашых выстаўках, мерапрыемствах, не толькі дае майстар-класы наведвальнікам аддзялення, але і перадае свой вопыт, уменне ўсім ахвотным, моладзі. Незаменны яе памочнік і муж, які суправаджае сяброўку па жыцці на ўсіх мерапрыемствах, — адзначыла дырэктар Цэнтра Анастасія Бутар.

Яшчэ адно пажаданне, каб у аддзяленнях дзённага знаходжання была медсястра, якая б пасля заняткаў, дапусцім, на трэнажорах, памерала ціск. «Сапраўды, актуальная заўвага, — пагадзілася з суразмоўнікамі Тамара Красоўская. — Да 2017 года была прадугледжана пасада медработніка, які пры неабходнасці мог аказаць пярвічную дапамогу. Гэтае пытанне адпрацуем на заканадаўчым узроўні».

Апошнім часам на Міншчыне вельмі запатрабаваны валанцёрскі рух. У ім удзельнічае звыш 500 валанцёраў сярэбранага ўзросту, якія аказваюць дапамогу па прынцыпе «роўны роўнаму». У Жодзіне група валанцёраў «Аптымісты» працуе з 2013 года. Прадстаўнікі горада расказалі, што пажылыя людзі сумесна з моладдзю аказваюць дапамогу састарэлым, інвалідамі, дзецямсіротам, уразлівым катэгорыям грамадзян, працуюць у экалагічным кірунку. На жаль, у заканадаўстве Беларусі не абазначана такое паняцце, як валанцёрская дзейнасць. Ці плануецца прыняцце адпаведнага нарматыўнага акта?

Праект закона аб валанцёрскай дзейнасці знаходзіцца ў першым чытанні ў парламенце, канстатавала Тамара Красоўская. Таму яшчэ не позна ўнесці ў яго свае прапановы.

Акрамя таго, удзельнікі сустрэчы выказаліся за тое, каб у Мінскай вобласці арганізавалі школу валанцёраў, дзе б яны маглі сабрацца тэрытарыяльна разам, абмеркаваць дасягненні, павучыцца, паўдзельнічаць у абласных мерапрыемствах, акцыях.

Старшыня гарвыканкама Жодзіна Дзмітрый Заблоцкі падтрымаў ініцыятыву і паабяцаў аказаць садзейнічанне. Усе прапановы, што прагучалі на форуме, будуць абагульнены і разгледжаны на VI Усебеларускім народным сходзе.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**




Слова — дэлегатам

## «Нагода для абмеркавання праблемы сельскіх кадраў»



**Ірына БЕЛАЯ, брыгадзір ААТ «БарысаўСаюзАгра», дэпутат Вяляцiцкага сельскага Савета Барысаўскага раёна.**

— Сход — выдатны шанц грунтоўна разгледзець праблемы сельскай моладзі, у прыватнасці, яе замацавання на вёсцы. Гэтыя пытанні турбуюць не адну мяне. Наша гаспадарка, якая мае жывёлагадоўчую мяса-малочную спецыялізацыю, а таксама займаецца вырошчваннем збожжа, лёну, буракоў, здабываннем насення траў, сёння адчувае недахоп кваліфікаваных кадраў. Хлопцаў і дзяўчат у навакольных вёсках быццам бы шмат, але яны ў большасці сваёй імкнуцца ўладкавацца на работу ў горадзе. З падобнымі праблемамі сутыкаюцца і іншыя гаспадаркі раёна. Так, пакуль адрозныя ўмовы жыцця і работы ў параўнанні з горадам не спрыяюць замацаванню маладых на вёсцы.

Зразумела, моладзь уяўляе сабой найбольш дынамічную частку нашага грамадства, што абумоўлена яе актыўным пошукам свайго месца ў прафесіі і жыцці. Праблемы моладзі ў вёсцы агульнавядомыя: адсутнасць уласнага жылля, невысокая зарплата, няясныя перспектывы кар'ернага росту і г. д. Ад стварэння належных умоў для павышэння сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці сельскай моладзі ў многім залежыць поспех развіцця рэгіёнаў Беларусі. Без маладых кадраў у аграпрамысловым комплексе і ў сацыяльнай сферы такі рух наперад немагчымы.

З гэтай нагоды трэба даць зразумелы і ясны адказ на пытанне: за якой вёскай будучыня? Вядома, за той, дзе ўмовы жыцця будуць не горшыя, а можа, і лепшыя за гарадскія. І заробкі таксама будуць на ўзроўні заробкаў гараджан. Такія бясспрэчныя перавагі могуць быць толькі ў аграрадках, дзе ёсць магчымасці для гэтага. І сапраўды, прыгожыя добраўпарадкаваныя аграгарадкі новага тыпу з развітымі інжынернай, транспартнай інфраструктурай і сацыяльнай сферай, дзіцячымі пляцоўкамі, кафэ, магчымасцю аказання бытавых і іншых паслуг ужо вабяць маладыя сем'і.

На мой погляд, сёння трэба больш актыўна займацца павышэннем матывацыі юнакоў і дзяўчат заставацца жыць і працаваць на роднай зямлі. У нашай краіне за апошнія гады набыты карысны досвед па працаўладкаванні моладзі на вёсцы. Скажам, пашырэнне мэтавага прыёму маладых людзей на сельскагаспадарчыя спецыяльнасці ў ВНУ і каледжах. Гэта дазваляе рыхтаваць надзейны рэзерв кадраў. Ёсць і іншыя захады, у тым ліку і выдзяленне пасля размеркавання жылля маладым спецыялістам ці яго аплата.

Прафарыентацыю трэба пачынаць са школы. Наколькі я ведаю, цяпер у вясковых школах Беларусі адкрыта 400 профільных аграрных класаў. Яны дазваляюць вучням старэйшых класаў на свае вочы ўбачыць рэальныя ўмовы працы ў сельскай гаспадарцы, выбраць тую прафесію, якая даспадобы, потым застацца працаваць на зямлі. Нямала выпускнікоў такіх класаў потым паступае ў аграрныя вучэбныя ўстановы.

Ролю сельскай школы ў замацаванні кадраў на вёсцы трэба ўздымаць, агучваць, абмяркоўваць. Бо менавіта ў сельскай школе ключ да поспеху ў вырашэнні многіх як эканамічных, так і сацыяльных праблем сельскай гаспадаркі. Увогуле ў маштабах краіны наспела неабходнасць арганізацыі аграрнай бізнесадукацыі для моладзі, якая жадае адкрыць малое прадпрыемства ў сваёй вёсцы, сваім раёне. Гэта ж просты шлях да стварэння новых рабочых месцаў, пашырэння самазанятасці.

Я чакаю ад сходу прыняцця рашэнняў, якія былі б накіраваныя на паляпшэнне ўмоў для замацавання кваліфікаваных кадраў, асабліва маладых рабочых і спецыялістаў, на вёсцы. У гэтым сэнсе цяжка пераацаніць значэнне Усебеларускага народнага веча, у рамках якога маецца выдатная магчымасць разам вызначыць прыярытэты і выпрацаваць меры для ўстойлівага развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Медыцына: практычны падыход

# Новыя магчымасці стаматолагаў

**Падчас пандэміі каранавіруса трапіць да стаматолага — няпростая задача. Калі планавая дапамога не аказвалася, гэта было ўвогуле немагчыма. Ды і не кожны адважыцца пайсці лішні раз у паліклініку ў такі неспакойны час. Тым не менш, лячэнне зубоў лепш не адкладваць надоўга. Спецыялісты расказалі, як COVID-19 адбіўся на рабоце стаматалагічнай службы, чаму беларусы сталі прыходзіць на прафілактыку часцей і якія вынаходніцтвы беларускіх медыкаў высока ацэнілі за мяжой.**

## ЦІ ЛЕЧАЦЬ ЗУБЫ ПАДЧАС ЭПІДЭМІІ?

— Нягледзячы на ўсе складанасці, звязаныя з эпідэмічнай абстаноўкай, стаматалагічная служба працавала ўстойліва і аказвала неабходную дапамогу. Ва ўсіх рэгіёнах былі арганізаваны выязныя брыгады для аказання неадкладнай стаматалагічнай дапамогі пацыентам з COVID-19 і людзям, якія знаходзяцца на самаізаляцыі. І цяпер аказанне такой дапамогі працягваецца, — расказвае **галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай стаматалагічнай паліклінікі, галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па стаматалогіі Андрэй МАТВЕЕЎ.**

Ён адзначыў, што яшчэ ў першую хвалю распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі знізілася наведвальнасць урачоў-стаматолагаў. Колькасць зваротаў упала на 20—30 %, праўда, у канцы мінулага года яна вырасла да 90 % ад звычайнай.

— І ў вясеннюю хвалю, і цяпер урачы-стаматолагі прымяняюць усе сродкі аховы, якія неабходны. І іх у нашай краіне дастаткова. Стаматолагі Еўропы канстатавалі, што дакументальна не адзначана ніводнага захворвання COVID-19, атрыманага ад урача-стаматолага ў еўрапейскіх краінах, — паведаміў суразмоўнік.

Пры гэтым пэўная колькасць урачоў-стаматолагаў і сярэдняга персаналу перанесла дадзеную інфекцыю ці працягвае хварэць.

Нягледзячы на тое, што большую частку мінулага года граніцы былі закрытыя, стаматалагічная служба выканала паказчыкі аказання платных паслуг на 90 %.

А збояў у пастаўках матэрыялаў у перыяд пандэміі не было. Спектр матэрыялаў, што прымяняецца ў нашай краіне, нічым не адрозніваецца ад тых, з якімі працуюць стаматолагі ў Маскве, Гамбургу ці Нью-Ёрку.

Андрэй Матвееў паведаміў, што на сёння ў дзяржаўным сектары стаматалагічнай службы працуе больш за 10 тысяч медыцынскіх работнікаў, з якіх 37,2 % — урачы-стаматолагі, прычым 2/3 іх занята ў бюджэтным сектары. Забяспечанасць урачамі-стаматолагамі ў нашай краіне складае 5,3 праміле на 10 тысяч насельніцтва, а агульная колькасць урачоў-стаматолагаў ад агульнай колькасці урачоў складае 9,8 %. Гэтыя лічбы супастаўляльныя з аналагічнымі па Еўропе.

## З ПРАФІЛАКТЫЧНАЙ МЭТАЙ

У структуры асноўных стаматалагічных захворванняў на першым месцы традыцыйна знаходзіцца карыес, ён займае 56 %, на другім месцы — апікальны перыядантыт (запаленне злучальнатканкавага комплексу), або ўскладненне карыесу (18 %), далей ідуць пульпіт (11 %) і зубныя адклады (5 %).

Андрэй Матвееў заўважыў, што летась каля 21 % пацыентаў звярнулася да стаматолагаў з прафілактычнымі мэтамі, з іх 10 % абсалютна здаровых ці раней былі санаваны. Адметна, што за апошнія дзесяць гадоў колькасць людзей, якія з прафілактычнай мэтай прыходзілі да стаматолага, вырасла ў 1,5–2 разы.

— З пачатку дзеяння праграм прафілактыкі стаматалагічных захворванняў толькі кожны 10-ы прыходзіў па прафілактыку, а сёння ўжо — кожны 5-ы. Першая праграма прафілактыкі, а яе роданачальнікам быў прафесар Пётр Леус, ахапіла ўсе рэгіёны краіны. Адчувальныя паказчыкі былі ў Магілёўскай вобласці і ў Мінску. У сталіцы яна дагэтуль працуе. Ёсць пілотныя праекты, напрыклад, у адной са школ у мінскім мікрараёне Лошыца. Мы адсочваем змены ў колькасці выпадкаў карыесу сярод дзяцей, якія пад кантролем чысцілі зубы з першага класа і да заканчэння школы. У іх захваральнасць зніжана ў два–тры разы, — падзяліўся суразмоўнік. — Сучаснае жыццё падштурхоўвае да таго, што наша ўсмешка павінна быць белая. Такое імкненне і папулярызацыя здаровага спосабу жыцця таксама сыгралі сваю ролю.



Паводле правіл, кожны з нас двойчы на год павінен наведваць урача-стаматолага з прафілактычнай мэтай. Паводле статыстыкі, за мінулы год кожны беларус пабываў у ўрача-стаматолага 1,6 раза.

— Такіх паказчыкаў удалося дасягнуць у тым ліку дзякуючы праграме «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», дзе адным з раздзелаў было стаматалагічнае здароўе. З гэтай мэтай праводзіліся абследаванні, закупкі і нанясенні фторпрэпаратаў і індыкатараў для выяўлення зубнога налёту. Разам з тым варта працягнуць дадзеную практыку, што і будзе зроблена ў новай праграме прафілактыкі стаматалагічных захворванняў, — падкрэсліў Андрэй Матвееў.

## КЛЕТАЧНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Сёння, нягледзячы на мінімізацыю міжнародных зносін з-за эпідэмічнай абстаноўкі, працягваецца работа з Міжнароднай стаматалагічнай асацыяцыяй, галіновымі арганізацыямі краін СНД. А беларуская вучоныя-стаматолагі праводзяць даследаванні па прыярытэтных кірунках навуковай дзейнасці.

**Сяргей РУБНІКОВІЧ, рэктар Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта,** які раней узначальваў кафедру артапедычнай стаматалогіі і артадантыі з курсам дзіцячай стаматалогіі БелМАПА і стаіць каля вытокаў беларускай школы клетачных тэхналогій, расказаў пра апошнія распрацоўкі:

— За апошнія сем гадоў сумеснай дзейнасці з Нацыянальнай акадэміяй навук мы дасягнулі добрых вынікаў. Вынайдзены арыгінальныя метады лячэння, створаны біятрансплантаты, распрацаваны спосабы імплантацыі мезенхімальных ствалавых клетак для лячэння розных стаматалагічных захворванняў, у прыватнасці, хвароб перыядонта, рэцэсіі (апускання) дзясны, хранічнага перыядантыту сярэдняй і цяжкай ступеняў. Яны дазваляюць у больш цяжкіх выпадках — страце зубоў — пры перыядантыце цяжкай ступені, пры станах, якія прыводзяць да выдалення зубоў, праводзіць органазахавальныя аперацыі і паляпшаць якасць жыцця пацыентаў. Гэта быў пілотны праект на постсавецкай прасторы, распрацаваны сумесна з Інстытутам біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук і акадэмікам Ігарам Валатоўскім.

Сутнасць метаду ў тым, што з тлушчавай тканкі пацыента атрымліваюць ствалавыя клеткі, якія затым уводзяць у праселыя ўчасткі дзясны. Ад эксперыментальных даследаванняў, накіраваных на ацэнку біятрансплантатаў, беларускія вучоныя ўжо дайшлі да практычнага выкарыстання гэтага метаду. Сёння ён прымяняецца на базе клінікі эстэтычнай стаматалогіі, у Нацыянальнай акадэміі навук на базе паліклінікі і клетачнага цэнтра. У межах навуковага даследавання такое лячэнне праводзілася за бюджэтныя сродкі, цяпер — на платнай аснове.

— Сёння гэта даступныя методыкі — яны зарэгістраваны і могуць выкарыстоўвацца ў клінічнай практыцы, — кажа Сяргей Рубнікові.

## ...І ІНШЫЯ АРЫГІНАЛЬНЫЯ МЕТАДЫ

Цяпер стаматолагі вядуць сумесную работу з Інстытутам генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі па выкарыстанні геномных тэхналогій, у прыватнасці, высокапрадукцыйнага ДНК-секвеніравання ў дыягностыцы і ацэнцы мутацыі генаў эпітэлію ў пацыентаў з пухліннымі і перадпухліннымі захворваннямі слізістай поласці рота, у прыватнасці, з лейкаплакіяй.

Яшчэ адзін новы кірунак — лячэнне пацыентаў з дысфункцыяй скронева-сківічнага сустава ў спалучэнні з бруксізмам (скрыгатаннем зубоў з іх далейшым сціраннем). Ён стартаваў нядаўна, хоць фундаментальнымі даследаваннямі ў гэтым кірунку беларускія навукоўцы займаюцца апошнія дзесяцігоддзе.

— Даследаванне па ўстанаўленні прычын гэтага захворвання праводзім сумесна з Інстытутам фізіялогіі НАН Беларусі. Яно дастаткова распаўсюджанае, у розных узроставых групах складае ад 20 да 60 %. Захворванне цяжка паддаецца лячэнню і карэкцыроўцы, усе нашы тэрапеўтычныя і артапедычныя рэстаўрацыі ў пацыентаў звозяцца на нішто, — расказвае Сяргей Рубнікові.

Шмат цікавых праектаў рэалізуецца на працягу апошніх дзесяці гадоў з рознымі ўніверсітэтамі, у прыватнасці БНТУ. Кампанія «Палітэхнік» стварыла спецыяльную інтэраральную прыладу для лячэння пацыентаў з сіндромам абструктыўнага апноэ і храпу. Гэтая рапрацоўка заняла першае месца і атрымала залаты медаль як найлепшы інавацыйны медыцынскі прадукт на выстаўцы ў Санкт-Пецярбургу ў верасні 2020 года.

— Гэта сведчыць пра тое, што нашы вынаходніцтвы выкарыстоўваюцца не толькі ў беларускай клінічнай практыцы, але маюць прызнанне і за мяжой, — адзначае рэктар БДМУ.

Сумесна з «Палітэхнікам» створаны арыгінальныя ўльтрагукавыя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюцца для паляпшэння якасці пламбіроўкі каранёвых каналаў. Створана арыгінальная прылада, якая прымяняецца для перыядантальнай імплантацыі пры астэаінтэграцыі (ужыўленні імплантаў).

Як расказала выконваючая абавязкі загадчыка кафедры тэрапеўтычнай стаматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Наталля Новак, у эстэтычнай стаматалогіі навукоўцамі распрацаваны малаінвазійныя метады лячэння зубоў са змененым колерам, з частковай адэнцыяй (адсутнасцю зубнога рада), пры якіх распрацаваны выраб адгезійных пратэзаў, метады лячэння шчылін і траўмаў зубоў, шыніравання зубоў пры рухомасці пасля траўмаў ці пры захворваннях тканак перыядонта. Усе метады малаінвазійныя і прадугледжваюць найменшае прэпараванне зубоў і органазахавальныя маніпуляцыі. Штогод на кафедры БелМАПА праходзіць навучанне прыкладна 500 урачоў.

# ЯК ПАЗБЕГНУЦЬ ТРАЎМАЎ НА ГОРЦЫ

**Катанне на цюбінгах — гэта адпачынак, які аднолькава падыходзіць дарослым і дзецям. Але, на жаль, з'яўляецца адным і з самых траўманебяспечных. У адрозненне ад санак, «ватрушкі» здольныя развіваць вялікую хуткасць і накат закручвацца вакол сваёй восі падчас спуску. Гэта дадае яркіх адчуванняў і адрэналіну, але цюбінг, развіваючы высокую хуткасць, становіцца абсалютна некіраваны, што пацвярджаюць мноства траўмаў.**

— Дарослы чалавек на цюбінгу, які ляціць на высокай хуткасці, падобны да аўтамабіля, у якога сапсаваліся тармазы, — ён альбо саб'е каго-небудзь, альбо ўрэжацца сам, — кажа **загадчык хірургічнага аддзялення 11-й гарадской паліклінікі Міраслаў ДЗЬЁЛАГ.**

Каб зрабіць свой адпачынак прыемным, а катанне на «ватрушках» бяспечным, урач раіць прытрымлівацца наступных правілаў:

— катацца толькі ў строга адведзеным, падрыхтаваным для гэтага месцы;

— перад спускам з горкі правяраць, каб на дарозе не было людзей;

— не пакідаць дзяцей без нагляду;

— не дазваляць дзецям катацца на непрыстасаваных снарадах, што можа прывесці да траўмавання.

Таксама нельга прымацоўваць цюбінгі адзін да аднаго «паравозікам», яны могуць перавярнуцца. Небяспечна садзіцца на цюбінг удваіх, з яго можна вылецець. Аднак дарослыя часта садзяць з сабой і дзяцей, што прыводзіць да сур'ёзных дзіцячых траўмаў.

— Катацца на надзіманых санках рэкамендуецца на горках з ухілам не больш за 20 градусаў. Унізе схілу павінна быць дастаткова месца для тармажэння. Таксама не варта катацца на цюбінгах па схілах, парослых дрэвамі. На трасе не павінна быць ям, кустоў, камянёў, — нагадвае ўрач.

Катацца на санках-«ватрушках» варта седзячы, не спрабуйце з'ехаць на іх стоячы або скачучы, як на батуце. Падчас катання рэкамендуецца трымацца за спецыяльныя рамяні, размешчаныя па баках цюбінга. Трымайце дыстанцыю не менш за 50 метраў або 20 секундаў паміж спускам папярэдняга цюбінга.

Каб пазбегнуць траўмаў, падчас спуску нельга тармазіць нагамі. Пасля заканчэння спуску варта неадкладна пакінуць зону катання. Калі спыніліся ці ўпалі, пастарайцеся хутка сысці з трасы, бо інакш саб'юць.

Калі вы напампоўвалі або падкачвалі «ватрушку» на холадзе, то пасля ўнясення яе ў цёплае памяшканне ці ў салон аўтамабіля рэкамендуецца выпусціць частку паветра з камеры. Калі «ватрушка» была моцна надзьмута халодным паветрам, то ў цяпле паветра пачне расшырацца і камера можа лопнуць.

— Не прывязвайце надзіманыя санкі да транспартных сродкаў: снегакатаў, снегаходаў, квадрацыклаў, аўтамабіляў.

— Не варта катацца на цюбінгах у стане алкагольнага ап'янення.

— Каб пазбегнуць сутыкнення з іншым цюбінгам, уздымайцеся на горку на бяспечнай адлегласці ад спуску.

Гэта абавязковыя ўмовы для таго, каб адпачынак не скончыўся ў бальніцы.

Чалавек — чалавеку

# ЖЫЦЦЁ І ГАЛУБЫ

**Мой тата быў галубятнікам. Так казала мама.**
**У яго было шмат галубоў розных масцяў і парод. Тады гэта было модным захапленнем.**
**Да нас прыходзілі і прыязджалі такія ж галубятнікі: сталыя і маладыя мужчыны, школьнікі, многія са сваімі гадаванцамі. Кожны хваліў сваіх, аглядаў іншых. Тут жа ішоў абмен. І галубоў запускалі ў неба...**

Потым, з вышыні пражытых гадоў, я зразумела: тата быў рамантыкам, любіў глядзець у неба...

Я таксама гляджу ў яго і бачу сіне-блакітнае ўдзень, залацiста-пунсовае надвячоркам... І ў ім, дзесь высока над галавой, стараюся адшукаць галубоў — птушак майго дзяцінства.

...Мама ў неба глядзела рэдка — цяжкая сялянская праца схіляла яе да зямлі, а ўгору вочы ўзнімаліся хіба зрэдку — для таго каб прыкінуць час. Калі сонца схілілася долу, а работы заставалася шмат, мама казала: «Падперці б яго ці што?»

Яна па жыцці была больш практычная, больш адказная і рашучая. «Трэба курэй больш завесці, — казала тату. — Дзесям лішняе яечка будзе, а то і капейка, бо што з тваіх галубоў?» — «Усё, больш разводзіць не буду», — адказваў тата.

А птушкі тым часам «разводзіліся» самі, і для іх пад страхою хлява ўсё больш падвешвалася старых лазовых кошыкаў ды ў паддашку з тыльнага боку хаты будаваўся цэлы «шматкватэрнік» з дзіркамі-вокнамі, у якія лёгка залятаалі галубы; колькі часу ёрзалі там, буркаталі, а потым высоўваліся і сваё прыгожыя галоўкі — садзіліся на ганак.

...Тата любіў і нас — дзяцей. У яго (у адрозненне ад мамы) быў добры мяккі характар. І таму, нешта «адкалоўшы», мы з сястрой прасіліся: «Татка, толькі маме не кажы, добра?»

Ён згаджаўся і з горада заўсёды прывозіў нам што-небудзь смачнае. У вачах да сёння стаіць невялічкі пакунак з дражэ «Каляровы гарошак». Колькі яго там было? Можа, грамаў дзвесце? Але мама, згледзеўшы, тут жа прызнала: «Гэта ж так дорага!.. А грошай дома — толькі на хлеб!»

Тата ў адказ хіба ўсміхнуўся ды ўздыхнуў: «Хай помняць мяне». Нібы адчуваў, што гэта яго апошні цукеркі.

...Ён пайшоў на той свет раптоўна, пакінуўшы маме дзяцей, гаспадарку, недабудаваную хату і... галубоў.

Знікаць яны сталі трохі пазней і неяк непрыкметна: пусцелі, а з цягам часу адрываліся і падалі на зямлю старыя кашы, пусцелі дзірачкі-вокны ў паддашку.

А мы жылі, працавалі, вучыліся, часта ўспаміналі тату ды яго галубоў, і неяк мама не вытрымала — адкрыла нам тайну, якую ёй, мабыць, цяжка было насіць: расказала, як аднойчы злазіла на паддашак, дастала з гнязда некалькі яек і пракалола іголкай. Галодны быў час. Яна не хацела карміць галубоў, і з часам яны зніклі зусім.

...Не ведаю, чаму, але цёмныя, пустыя «вокны» таго нежывога, нежылога «шматкватэрніка» нагадваюць мне цягнік з пустымі вагонамі, які імчыць у невядомым напрамку.

**Таццяна Новік,**
*г. Клецк.*

Як ёсць, так ёсць

# Горкі шакалад

**...Ігнат таптаўся каля прылаўка і ніяк не мог выбраць, што б такое купіць? З аднаго боку траціцца яму зусім не хацелася, а з другога — не ісці ж да жанчыны з пустымі рукамі?**

...Ганну ён ведаў яшчэ з маладосці, яны сустракаліся, але ж потым Ігнат ажаніўся з яе сяброўкай, трохі пажыў, развёўся, ажаніўся яшчэ раз... А пад старасць застаўся адзін: у дзяцей сваё жыццё, сябры недзе пагубляліся. З дому цяпер хіба ў краму ды ў паліклініку.

Ну, і да Ганны...

Ворагамі з-за той першай яго жаніцьбы яны чамусьці не сталі, недзе сустрэўшыся, заўсёды віталіся, размаўлялі, а калі Ганна аўдавела, Ігнат стаў хадзіць да яе на гарбату — адводзіць душу ўспамінамі.

— Вы нешта канкрэтнае шукаеце? Можа, вам дапамагчы? — прапанавала Ігнату маладзенькая прадавачка.

— Не. Не трэба, — адмовіўся ён, — бо тут жа ўбачыў палічку з надпісам «Зніжкі». Выбраўшы там плітку шакаладу, Ігнат пашыбаваў да касы. Ён ведаў, што Ганна любіць малочны шакалад, але сёння на зніжках быў толькі чорны.

**Вольга Федзяшына,**
*г. Слуцк.*

Свой погляд

# ДЗЕНЬ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА: ПРАЎДА І ВЫДУМКІ

**Перапляценне свецкіх і царкоўных свят — з'ява ўжо звычайная, хоць нярэдка яны, гэтыя святы, і супярэчаць адно аднаму. Яскравы прыклад — «Дзень усіх закаханых» альбо «Святога Валянціна».**

Ці быў насамрэч такі святы? Быў: на Захадзе з V стагоддзя шануюць памяць свяшчэннамучаніка Валянціна Інтэрамскага — біскупа італьянскага горада Інтэрамны (цяпер г. Церні), вядомага цудоўнымі вылячэннямі і пакаранага смерцю 14 лютага 270 года за схіленне да хрысціянства сына кіраўніка горада.

«Наш» гэта святы ці каталіцкі? Усе святыя, якія здзейснілі свой подзвіг у Заходняй Еўропе да 1054 года (да разрыву праваслаўя і каталіцтва), — нашы агульныя хрысціянскія святыя. З 1969 года ў каталіцкай царкве ў шэрагу заходніх епархій адзначаецца памяць свяшчэннамучаніка Валянціна Інтэрамскага. Шануецца яна і ў святцах Рускай праваслаўнай царквы, але 12 жніўня. А вось 14 лютага, перад Стрэчаннем Госпадним, — Дзень святога пакутніка Трыфана.

Такім чынам «Дзень усіх закаханых» носіць выключна свецкі, камерцыйны характар, калі «робіцца грошы» на ўсім, нават на святых. І праваслаўная, і каталіцкая цэрквы асуджаюць не само гэтае свята, а яго змест. Да таго ж, калі грамадства, мякка кажучы, ігнаруе царкоўны каляндар, часам здараюцца трагедыі. Не так даўно, 14 лютага 2004 года, пад свята Стрэчання Гасподняга, у дзень Усяленскай бацькоўскай суботы, у Маскоўскім аквапарку, пабудаваным на месцы могілак, моладзь у купальных касцюмах святкавала «Дзень Святога Валянціна». Дыскатэка скончылася трагедыяй... У 1999 годзе ў Мінску на Святую Тройцу, заглушаючы богаслужэнні ў найбліжэйшых храмах, шумна адзначалі «свята піва». Жудасныя падзеі на Нямізе памятаюць, напэўна, усе сучаснікі. А вось бачыць тут выпадковасць ці заканамернасць — асабістая справа кожнага.

...У Маскве ў Храме Хрыста Збавіцеля знаходзіцца каўчэг з часціцай мошчаў святога Валянціна Інтэрамскага. У нас у горадзе Смалявічы ёсць каталіцкі храм у гонар гэтага святога, каля яго знаходзіцца помнік, дзе ў любы час можна памаліцца.

**Наталля Сівак,**
*в. Заполле, Чэрвеньскі раён.*

Наш чалавек!

# «СЯДЗЕШ ШЫЦЬ, І ДУМКІ ПРЫХОДЗЯЦЬ СВЕТЛЫЯ»

**...Трапіўшы ў аграгарадок Якубаўшчына, што ў Лёзненскім раёне, проста грэх было не зайсці да мясцовай майстрыхі Марыі Фёдараўны Бізунковай, не пабачыць яе работы, не распытаць пра... 93 пражытыя ёю гады.**



— Нарадзілася на гэтай зямлі, — кажа найстарэйшая жыхарка мястэчка, — і на ёй, можа, век свой звякую... Нас у сям'і пяцёра было, я — самая старэйшая, потым брат і яшчэ тры сястрычкі. Бацькі нашы Фёдар Цярэнцьевіч і Аляксандра Іванаўна Данчанкі — простыя сяляне-беднякі, потым калгаснікі. А ім тады замест грошай налічвалі працадні. Па выніках года на кожны маглі выдаць нейкія прыгаршчы збажыны ды лічаныя капейкі. На іх дзяцей ні абуць, ні апрануць. Так што прыйшлося вучыцца латаць, перашываць са старога. Спачатку — вядома ж, рукамі...

Нам нялёгка жылося, а тут яшчэ і вайна. Бацьку з фронту мы не дачакаліся, прапаў без вестак. Маме цяжка было нас гадаваць, таму, як толькі падраслі, мусілі зарабляць: хто ў няньках быў, хто ў пастушках... А ў 43-м немцы сталі моладзь збіраць для адпраўкі ў Германію. Тады Пётр Бізункоў, каб застацца, каб пазбегнуць нявolі, і ўгаварыў мяне выйсці замуж: узяў за руку і прывёў да сваёй матулі.

У 1944-м сямнаццацігадовая Марыя ўжо нарадзіла першынца. Барысам назвалі. А далей дзеткі пасыпаліся адно за адным. Аліна з'явілася на свет у 1949-м, у 53-м — Валянціна, Віталь — у 59-м, Надзея — у 60-м, Ірына — у 65-м. Шматдзетная матуля па-ранейшаму працавала ў калгасе — то на так званых палявых работах, то на ферме — даяркай, цялятніцай. Яе Пётр Васілевіч быў механізатарам. Разам яны пабудавалі дом, пастаянна трымалі вялікую гаспадарку. У свой час, бралі ў арэнду тры гектары зямлі, садзілі шмат бульбы, сеялі збажыну, нарыхтоўвалі сена на дзвюх кароў і бычка. Свіней трымалі, курэй, індыкоў, нутрый, нават тхароў. Ведама, сям'я, шасцёра дзяцей, і ўсіх трэба накарміць, апрануць, у школу адправіць.



Вось тут гаспадыні зноў прыдалося ўменне шыць. На шчасце, хросная падарыла Марыі швейную машынку «Зінгер», якая стала і памочніцай, і вернай сяброўкай на многія-многія гады... Яна, дарэчы, і сёння служыць — стаіць напагатове ў пярэднім пакоі.

А вось дзеці даўно павырасталі, усе атрымалі адукацыю. З сям'і выйшла трое педагогаў — Аліна, Надзея і Ірына. Валянціна атрымала прафесію швачкі. Віталь служыць пажарным-ратавальнікам. Барыс, відаць, мог бы стаць музыкантам ды... загінуў падчас вучобы ў Віцебску, патануў у Дзвіне. У бацькоўскай хаце партрэт яго на самым бачным месцы. Побач з ім і фота Аліны, яна таксама рана пайшла з жыцця. Як і гаспадар — муж Марыі Фёдараўны.

— Ад гэтых страт нейкая пустэча ў душы была, — прызнаецца жанчына. — Плакала, перажывала і міжволі ўзялася перабіраць абрэзкі тканіны. Шыла ж пастаянна, латак нейкіх шмат заставалася... Пачала выразаць з іх нейкія кветкі-лісточкі, нашываць на сурвэткі, на аднатонныя абрусы, на пакрывалы.

І такім чынам ствараць незвычайныя посцілкі, накідкі, нават дываны. Яны да сёння ўпрыгожваюць хату — крэслы, канапу, ложкі, сцены.

— Дочкам надарыла такой вось самаробнай прыгажосці, — хваліцца матуля. — Цяпер яна, можа, і нямодная, але ж рукі мае самі цягнуцца да швейнай машынкі. Кожны дзень што-небудзь майструю — то праўнукам нейкія рэчы, то неяк калгас папрасіў пашыць палотны для сушкі зерня: чатыры паласы па дванаццаць метраў... Прыйшлося вынесці машынку на двор, але ж заказ выканаць.

Акрамя згаданага «Зінгера», у Марыі Фёдараўны ёсць «Чайка-142» і сучасная электрычная машынка. Не падводзіць, дзякаваць богу, зрок. Да таго ж, як прызнаецца, «сядзеш шыць і думкі прыходзяць светлыя», хочацца жыць для сваіх любімых дзяцей, для васьмярых унукаў і васьмярых праўнукаў, пра якіх, гартаючы фотаальбомы, выразкі з газет і часопісаў, бабуля можа расказваць бясконца.

...Час ад часу дзеці збіраюцца ў матулі, дапамагаюць у гаспадарчых справах. Найчасцей бываюць Ірына з мужам, бо жывуць яны таксама ў Якубаўшчыне. З Віцебска прыязджаюць Валянціна і Віталь з жонкаю Нінай. Гэта, у асноўным, іх рукамі трымаецца парадак у доме, на падворку, у гародзе...

Усіх дачок Марыя Фёдараўна ў свой час навучыла шыць, і кожнай, хоць у нейкай меры, але ж гэта спатрэбілася. А вось для яе самой, як выглядае, жыць — значыць проста шыць і па магчымасці ўпрыгожваць свет.

**Таццяна Ігнаценка,**
*г. Лёзна.*

Вашы правы

# Спагнанікі супраць даўжнікоў

## Паўнамоцтвы судовых выканаўцаў зменяцца летам

**Змяненні ў Законы «Аб выканаўчым вядзенні» і «Аб судовых выканаўцах» запрацуюць у Беларусі ў ліпені 2021 года. Пра найбольш канцэптуальныя з іх расказала распрацоўшчык закона Кацярына ЛЯХАВА, кансультант упраўлення прававога забеспячэння галоўнага ўпраўлення прымусовага выканання Міністэрства юстыцыі.**

### Каго задаволяць першым?

Нагадаем, што Законы «Аб выканаўчым вядзенні» і «Аб судовых выканаўцах» былі прынятыя ў 2016-м і запрацавалі ў 2017 годзе. Тады пашырылі магчымасці і правы судовых выканаўцаў, павысілі іх службовы статус, а таксама ўзмацнілі ролю патрабавальнікаў доўгу. Нягледзячы на тое, што з таго моманту прайшло не так шмат часу, узнікла «аб'ектыўная неабходнасць карэкціроўкі гэтых прававых актаў», паведаміла эксперт:

— Змяненне ўказаных законаў абумоўлена развіццём грамадства, інфармацыйных тэхналогій і эканамічных адносін, што патрабуе своечасовага ўдасканалення дзейных падыходаў. А асобныя палажэнні закона прапанаваныя з улікам практыкі іх прымянення ў замежных калег і ацэнкі эфектыўнасці выкарыстання ў межах міжнароднага ўзаемадзеяння.

Змяненнямі ў законы мяркуецца, напрыклад, скарэктаваць чарговасць задавальнення патрабаванняў спагнанікаў. Больш прыярытэтнымі стануць патрабаванні, якія маюць сацыяльную накіраванасць. Гэта, напрыклад, датычыцца аплаты працы грамадзян, якія працавалі ці працуюць у даўжніка па працоўным ці грамадзянска-прававых дагаворах, прадмет якіх — выкананне работ, аказанне паслуг ці стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці. А таксама пакрыцця ўрону, нанесены злачынствам або адміністрацыйным правапарушэннем.

На першым месцы, як і раней, застанецца задавальненне спагнанняў па аліментах, пакрыццё расходаў на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным утрыманні, а таксама кампенсацыя за ўрон, нанесены жыццю і здароўю.

— Калі з даўжніка спагнана недастаткова сродкаў, то, каб задаволіць патрабаванні спагнаннікаў, запазычанасць ім будзе вяртацца прапарцыянальна сумам, якія неплацельшчык вінаваты кожнаму з іх, — удакладніла Кацярына Ляхава.

### Медыяцыя як матывацыя

Мяркуецца ўкараніць сістэму матывацыі для даўжніка і спагнанніка запазычанасці праз магчымасці інстытута медыяцыі. Такая прапанова скіравана на стымуляванне добраахвотнага ўрэгулявання бакамі спрэчкі пытанняў пакрыцця запазычанасці па выканаўчых дакументах, расказала прадстаўніца Мінюста:

— Заключэнне паміж патрабавальнікам і даўжніком пагаднення аб прымяненні медыяцыі стане, па-першае, падставай для прыпынення выканаўчага вядзення. Па-другое, у выпадку заключэння міравога пагаднення паміж бакамі або наяўнасці медыяцыйнага пагаднення пры існаванні падстаў для спагнання прымусовага збору яго памер складзе палову ад устаноўленага.

### Каб прадаць арыштаванае

Маёмасць, якую забралі за даўгі, змогуць пасля няўдалай спробы продажу пераацэньваць не адзін раз, а чатыры.

Калі ў прадугледжаны законам тэрмін маёмасць даўжніка не рэалізавалі, замест адной пераацэнкі, якая цяпер складае да 20 % ад першапачатковага кошту, можна будзе праводзіць чатыры такія працэдуры. Пры гэтым устаноўлены фіксаваны памер пераацэнкі — 20 % ад першаснай цаны арыштаванай маёмасці.

Каб зрабіць таргі (у тым ліку электронныя) больш выніковымі, умовы іх правядзення зменяць. Калі пакупнік маёмасці падчас таргоў не аплачвае кошт, за які яна была набытая, або высветліцца, што ўдзельнік таргоў не меў права ўдзельнічаць у іх, тады права набыць маёмасць перадаецца іншаму ўдзельніку таргоў. У дадзеным выпадку — таму, хто не стаў пераможцам таргоў, але зрабіў перадапошнюю стаўку.

### «Электронны» дакумент і экстэрытарыяльнасць

Асобныя канцэптуальныя змяненні, замацаваныя ў законе, скіраваны на развіццё інфармацыйных тэхналогій у дзейнасці органаў прымусовага выканання. Прадугледжана, напрыклад, магчымасць накіроўваць працэсуальныя дакументы бакам выканаўчага вядзення ў электронным выглядзе, што павысіць аператыўнасць атрымання дакументаў абодвума бакамі, удакладніла спецыяліст.

Запрацуе таксама прынцып экстэрытарыяльнасці ў дачыненні да дзейнасці органаў прымусовага выканання. Гэта азначае, што паўнамоцтвы судовага выканаўцы будуць распаўсюджвацца на ўсю Беларусь, а не на дакладную тэрыторыю краіны.

— Замацаванне гэтай нормы дазволіць аператыўна здзяйсняць выканаўчыя вядзенні, у тым ліку і на тэрыторыі іншай вобласці, раёна, раёна ў горадзе, — падкрэсліла Кацярына Ляхава.

### Дазвол на абмежаванне

Судовым выканаўцам дадуць права прымаць меры ў выглядзе часовага абмежавання правоў даўжнікоў (грамадзян і індывідуальных прадпрымальнікаў) на кіраванне транспартнымі сродкамі і маторнымі маламернымі судамі, магутнасць рухавіка якіх перавышае пяць конскіх сіл, а таксама права на паляванне. Пакуль такія правы знаходзяцца ў кампетэнцыі судоў.

Разам з пашырэннем паўнамоцтваў павышаюцца і патрабаванні да пасады судовага выканаўцы. Прадугледжваецца неабходнасць праходжання кандыдатам на пасаду судовага выканаўцы стажыроўкі і тэсціравання на веданне заканадаўства аб выканаўчым вядзенні.

Такія правілы неабходныя з улікам высокай адказнасці судовых выканаўцаў падчас выканання службовых абавязкаў.

### ...І больш магчымасцяў

Некаторыя змяненні ў законы закрануць і спагнаннікаў даўгоў. Напрыклад, накіраванне выканаўчага дакумента па месцы атрымання даўжніком заробку ці даходаў, якія прыраўноўваюцца да яго, больш не будзе падставай для спынення выканаўчага вядзення.

Даванне судом ці іншым упаўнаважаным органам (асобай) адтэрміноўкі ці растэрміноўкі здзяйснення выканаўчага дакумента стане падставай толькі для прыпынення выканаўчага вядзення.

Акрамя таго, спрошчаны парадак абскарджання пастаноў, дзеянняў (бяздзейнасці) судовых выканаўцаў. Устаноўлены мінімальныя патрабаванні пры падачы дакументаў для разгляду працэсуальнай скаргі.

Закон мае на ўвазе таксама спрашчэнне парадку звяртання спагнаннікаў у орган прымусовага выканання для ўзбуджэння выканаўчага вядзення. Абавязак спагнанніка найперш прад'явіць аплатнае патрабаванне, аформленае на падставе выканаўчага дакумента, у банк ці небанкаўскую крэдытна-фінансавую арганізацыю для спісання ў бясспрэчным парадку грошай з рахунку даўжніка (індывідуальнага прадпрымальніка ці юрыдычнай асобы), перш чым выканаўчы дакумент будзе прад'яўлены да здзяйснення ў орган прымусовага выканання, заменяць правам спагнанніка ажыццявіць гэтае дзеянне.

**Ірына СІДАРОК.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки». г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «ТРЕСТ № 26 ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ», г. Минск, 220073, ул. Харьковская, 15, +375173958917, +375293928906** |

**Предмет аукциона: капитальные строения, реализуемые одним лотом**

**Открытый склад металла № 1** (сооружение специализированное складов, хранилищ) общей площадью 10146,7 кв. м, инвентарный номер 350/С-187388, по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254В. **Обременение: аренда**

**Здание теплопункта** (здание специализированное энергетики) общей площадью 42,9 кв. м, инв. номер 350/С-88096, по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 254. Составные части и принадлежности: отмостка

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания открытого склада металла № 1, здания теплопункта общей площадью 1,6690 га

**Начальная цена без НДС** – 277 020,00 белорусского рубля
**Шаг аукциона** – 13 851,00 белорусского рубля

**Порядок ознакомления с предметом аукциона: осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Дриневский Виктор Васильевич, тел. +375(29) 603 49 02**

**Дополнительная информация:** регистрация перехода права собственности на предмет аукциона к Покупателю будет осуществляться в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)». Государственная регистрация договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет

Лица, желающие принять участие в торгах обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 22.12.2020 г., на сайте ЕГРСоБ 22.12.2020 г.

**Аукцион состоится 26.02.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

**Для участия в аукционе необходимо перечислить организатору торгов задаток, а также подать заявление с приложением всех необходимых документов в срок с 9.00 10.02.2021 до 17.00 24.02.2021 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Контактные телефоны: +375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

УНН 190431606

**УП «Белконфискат»**
**объявляет о проведении электронных торгов 04.03.2021 г. по продаже имущества Дервенковой Е.В.**
**автомобиль «Lada Vesta», 2019 г. в.,**
**начальной стоимостью 13 300 рублей.**
На сайте **belkonfiskat.by** размещена информация о торгах.
Справки по тел. **8 (017) 363 94 89.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 11 марта 2021 года проводит 4-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 37 | Специальный автомобиль Урал-43203 с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 01058, 1988 г., *4 кат.* Автошасси Урал-43203, ш. 086814, дв. 168181, 1987 г., *4 кат.*, *5588 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 12 000,00 | 2 400,00 |
| 38 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ (демилитаризованный) ш. 110067087, дв. 489249, 1978 г., *4 кат.*, *9546 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 49 000,00 | 9 800,00 |
| 39 | Специальный автомобиль Урал-375 с кузовом-фургоном КБ1-375 в составе: кузов-фургон КБ1-375 № 112007, 1984 г., *2 кат.* Автошасси Урал-375, ш. 430489, дв. 268507, 1984 г., 3 кат., *1748 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 8 400,00 | 1 680,00 |
| 40 | Специальный автомобиль КамАЗ-4310 с кузовом-фургоном К1 4320Д в составе: кузов-фургон К1-4320Д № 01416, 1989 г., *4 кат.* Автошасси КамАЗ-4310 ш. 0055667, дв. 0374580, 1988 г., *4 кат.*, *19816 км* | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 14 000,00 | 2 800.00 |
| 41 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131Н с кузовом-фургоном К2-131 в составе: кузов-фургон К2-131 № 04321, 1991 г., *2 кат.* Автошасси ЗиЛ-131Н ш. 929657, дв. 775771, 1991 г., *4 кат.*, *3872 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 42 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К6-131 в составе: кузов-фургон К6-131 № 607204, 1978 г., *2 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 308801, дв. 696132, 1978 г., *3 кат.*, *1541 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 6 000,00 | 1 200,00 |
| 43 | Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном КБ1-375 в составе: кузов-фургон К2-375 № 050718, 1983 г., *2 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 399849, дв. 891474, 1983 г., *3 кат.*, *47 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 44 | Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном КБ1-375 в составе: кузов-фургон КБ1-375 № 091791, 1986 г., *2 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 449849, дв. 692869, 1986 г., *4 кат.*, *4634 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 8 500,00 | 1 700,00 |
| 45 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5251 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 10Е8811042, дв. 8849488, 1988 г., *4 кат.*, *8388 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № БД3658СММИ 1988 г., 4 кат | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 80 000,00 | 16 000,00 |
| 46 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5246-1 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 10Е8905049, дв. 8909743, 1989 г., *4 кат.*, *11264 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № БД3658СМРР, 1989 г., 4 кат | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 78 000,00 | 15 600,00 |
| 47 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5139 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 10Е8903045, дв. 8908910, 1989 г., *4 кат.*, *4992 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № БВ3658СМПВ, 1989 г., 4 кат | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 80 000,00 | 16 000,00 |
| 48 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5252 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 10Е8905066, дв. 8907787, 1989 г., *4 кат.*, *1167 км.* Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № ББ3658СМВР, 1989 г., 4 кат | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 80 000,00 | 16 000,00 |
| 49 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу (демилитаризованное) из-под Р-330Б № 5146 в составе: гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 10Е8905030, дв. 8907601, 1989 г., 4 кат., 15373 км. Электроагрегат АД16У-Т/400 1ВП № БС3658СМРК, 1989 г., 4 кат | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 78 000,00 | 15 600,00 |
| 50 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном КФ-1МП в составе: кузов-фургон КФ-1МП № 39010123, 1984 г., 4 кат. Автошасси ГАЗ-66, ш. 0353810, дв. 241967, 1983 г., 3 кат., 1514 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 4 800,00 | 960,00 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 11 марта 2021 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 5 марта 2021 года.

**Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 11 марта 2021 г. с 9.15 до 10.00.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусского рубля за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

**Справки по тел/факс: (017) 319 35 41.**
**Извещение опубликовано на сайтах http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by**

Хочаце — верце...

# ІНДЫКАТАРЫ НАДВОР'Я

## На пасаду «выклікальніка дажджу» прызначаюцца...

**Жывёлы і расліны вельмі чуйна рэагуюць на змены надвор'я. Навукоўцы налічваюць у Еўразіі каля 600 відаў жывёл і 400 відаў раслін, якія могуць выступаць як прадказальнікі штормаў, бур або добрага бясхмарнага надвор'я.**

### ПАПРАСІЦЬ ПАРАДЫ Ў ПРЫРОДЫ

Між іншым, сярод насякомых ёсць шмат прыродных сіноптыкаў, якія беспамылкова прадбачаць змены надвор'я. Загадзя — за некалькі гадзін ці нават за суткі да падзеі. А вось мурашы, пчолы і маленькі жучок — трубкакрут бярозавы «бачаць» сінаптычную афарбоўку зімы і лета на некалькі месяцаў наперад.

Так, гэта праўда. На думку спецыялістаў секцыі «Экалогія і краязнаўства» Рэспубліканскага экалагічнага цэнтра, найлепшы летні сіноптык у Беларусі — чорны маленькі жучок, трубкакрут бярозавы. Надвор'е ў чэрвені—ліпені можна прадказаць па яго паводзінах.



Трубкакрут рэжа ліст бярозы і скручвае з яго мяшочак, дзе потым будзе гадавацца лічынка жука. Менавіта па памерах недарэзанага раўчука, на якім вісіць мяшочак, і магчыма зрабіць выснову аб будучым характары лета. Калі жук вырашыў зрабіць раўчук доўгім — лета будзе дажджлівае і ветранае. У такі сезон мяшочак павінен больш часу вісець на дрэве, каб не трапіць у вільготную траву. У сухое і спякотнае лета кароткі раўчук хутка абломіцца, і лічынка пачне хавацца ад бязлітаснага сонца ў траве. За ўвесь час назіранняў сінаптычны жук ніколі не схібіў, бо памылка ў даўжыні недарэзанага раўчука будзе каштаваць жыцця яго патомству.

За ўвесь час назіранняў гэты жук дакладна паказваў рэальнае надвор'е на два месяцы, але толькі для дадзенай канкрэтнай мясцовасці. У Мінскай вобласці мясцовы трубкакрут можа рэзаць лісце бярозы зусім інакш, чым гэта будзе рабіць яго сабрат на Брэстчыне.

У такіх больш высокаарганізаваных насякомых, як пчолы і мурашкі, надвор'е «чытаецца» на ўзроўні інтуіцыі і шматгадовага вопыту ўсіх членаў сям'і. Па зладжаных дзеяннях усяго сямейства мурашоў магчыма акрэсліць памеры веснавой паводкі. Калі мурашкі загадзя здымаюцца са сваіх месцаў і забіраюць з сабою лічынак і ежу, то гэтыя мясціны абавязкова залье вадой.

Уважліва назіраючы за мясцовымі мурашкамі, можна загадзя даведацца, якая нас чакае зіма. Калі за лета да восені мурашы не падсыпалі свой «капец» на мурашніку, не ўзмацнялі яго з бакоў — зіма будзе цёплая. Вельмі добра «чытаюць» мурашы «кароткае» надвор'е. Грыбнікі ў лесе заўважалі, што часам неба хмурыцца, а мурашы працягваюць мітусіцца па сваіх справах — значыць дажджу не будзе.



Суровую зіму адчуваюць і пчолы. Калі пчолы восенню шчыльна заляпляюць воскам ляток, і застаецца толькі маленькая шчыліна — чакай зімой моцных маразоў. Ранні вылет пчол з вулля сведчыць аб дружнай і цёплай вясне. Самым жа рамантычным насякомым, якое прадкажа вам добрае надвор'е на заўтра, з'яўляецца светлячок. Перад сонечным днём светлячкі будуць зіхацець уначы, як зоркі. Перад дажджом — «цёмнае» маўчанне.

### КАЛІ КАМАРЫ «МАК ТАЎКУЦЬ»

Усе з дзяцінства ведаюць народныя прыкметы, па якіх лёгка можна скласці кароткачасовы прагноз надвор'я. Так, калі ў полі ці на агародах увечары камары пачынаюць збірацца ў вялікія жывыя шары — «мак таўчы», гэта сведчыць, што заўтра абавязкова будзе цёплае і сонечнае надвор'е.

Калі ж летам вы спыніліся адпачываць каля ракі і раптам заўважылі, што вас пачалі злосна атакаваць авадні — хуценька шукайце парасоны ці нейкі «дах» над галавой. У венграў на гэты конт існуе нават прымаўка: «Нешта скаціна брыкаецца — няўжо гэта дождж пачынаецца». І сапраўды, перад моцным дажджом гэтыя вялікія крывасмокі пачынаюць надзвычай актыўна атакаваць і жывёл, і людзей.

Моцны ўраган у нашых шыротах магчыма прадказаць за 2—5 гадзін да з'явы, назіраючы за паводзінамі стракоз. Гэтыя шумныя летуны пры хуткім зніжэнні атмасфернага ціску пачынаюць мітусіцца каля самай зямлі, збіраюцца ў паветры ў клубкі ды потым хорам стракочаць і нават пішчаць.

За некалькі гадзін да навальніцы матылькрапіўнік ужо больш не лётае, а хуценька хаваецца ў шчылінах. Перад дрэнным надвор'ем з вачэй знікаюць мухі — у гэты час яны маркоцяцца на платах і сценах дамоў. Мухі лічаць за лепшае не рызыкаваць, нават калі неба яшчэ зусім чыстае. Якім чынам насякомыя «бачаць» будучае надвор'е? Спецыялісты мяркуюць, што ў гэтых істот ёсць свой уласны дакладны індыкатар атмасфернага ціску і «прыбор» па вымярэнні электрычнага напружання і вільготнасці паветра.

### УМЕЦЬ «ЧЫТАЦЬ» КНІГУ ЛЯСОЎ І ЛУГОЎ

Характэрнай асаблівасцю валодаюць хвойныя дрэвы: яны апускаюць галіны ўніз перад дажджом і падымаюць уверх перад ясным надвор'ем, што асабліва відаць у елкі. Уласцівасцю натуральнага барометра валодае і сухое дрэва. Дуброва шуміць да непагадзі. Трэск дрэў у лесе ўзмацняецца да цяпла. Калі ў зацішнае надвор'е лес моцна шуміць, то летам гэта да дажджу, зімой — да адлігі.

Па лугавых кветках і траве можна рабіць і доўгатэрміновыя прагнозы. Напрыклад, калі ў канцы лета працягваюць сваё красаванне звычайныя казяльцы, стрэлкі, канюшына, крапіва, лекавы крываўнік, — абавязкова будзе цёплая восень.

### РАСЛІНЫ-«ПЛАКСЫ»

На лісці некаторых раслін за 2-3 дні да наступлення зацяжной дажджлівай непагадзі з'яўляюцца «слёзы» — кропелькі вільгаці. Так яны загадзя пазбаўляюцца ад празмернай колькасці вады ў сваёй структуры — пры павышэнні вільготнасці паветра ў раслін паменшаецца не натуральнае выпарванне. Гэтая з'ява ў батанічнай навуцы называецца гутацыяй (ад лацінскага gutta — «кропля»). Самыя вялікія «плаксы» — гэта клён вастралісты, розныя віды вербаў, конскі каштан звычайны, алешына, асіна, чаромха звычайная, таполя чорная і іншыя.

Варта давяраць прадчуванню чальчака вербалістага, які атрымаў у народзе назву «плакун-трава». Калі ў небеззяе сонца, а на вузкіх, доўгіх лістах чальчаку з'яўляюцца «слёзы», хутка надвор'е кардынальна зменіцца. Перад непагаддзю «плачуць» і расліны, што растуць каля вадаёмаў, такія, як асака дзірваністая, водны трыпутнік, водная расліна стрэлкаліст.

«Дажджавым дрэвам» называюць распаўсюджаныя на клумбах мегаполісаў кветкі каны. Калі раніцай на шырокім лісці гэтых заморскіх красунь, што квітнеюць да восеньскіх халадоў, выступаюць празрыстыя кроплі вільгаці, удзень абавязкова пойдзе дождж.

### ПАКАЁВЫЯ РАСЛІНЫ-СІНОПТЫКІ

Здаецца, пакаёвым раслінам непагадзь нічым не пагражае. Аднак генетычная памяць прымушае іх таксама рэагаваць на змены надвор'я. Асабліва адчувальная да прыродных катаклізмаў госця з тропікаў — экзатычная манстэра. Варта ўзяць з сабой на шпацыр парасон, нягледзячы на тое, што за акном ззяе сонейка, калі на яе лісці выступілі буйныя кроплі вільгаці.

Падобным чынам сігналяць пра надыход дажджлівага надвор'я сцындапсус залацісты, пярэстая маранта, хойя мясістая, банан пакаёвы. А ўсім вядомую алаказію, якая «плача» перад дажджом, за яе здольнасць дакладна прадказваць непагадзь нават называюць «пагоднікам».

У старыя часы людзі адмыслова, у якасці прыроднага пакаёвага барометра вырошчвалі на падаконніках расліну кісліцу (заечую капусту). Днём яна трымае свае лісцікі ў вертыкальным становішчы, а ўначы апускае ўніз. Калі ж гэта здараецца і ўдзень — напэўна, хутка пральецца дождж.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# З ВОГНЕННАЙ ПАРАЙ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Месцаў, адкуль можа пачацца пажар у лазні (калі не лічыць занесенай крыніцы агню), усяго два — печ і комін.

— У пагоні за прыгажосцю ў якасці коміна гаспадары дамоў нярэдка выкарыстоўваюць сэндвіч-трубы, — кажа Анастасія Швайбовіч. — Але ў большасці сваёй яны вырабляюцца з матэрыялаў неналежнай якасці і няздольныя адпавядаць умовам пажарнай бяспекі. Часам з такой сэндвіч-трубой могуць судакранацца драўляныя канструкцыі самога жылога дома. Канешне, класічная цагляная кладка не такая прыгожая. Але цяпер існуе вялікая колькасць вогнеўстойлівых матэрыялаў, якія могуць выкарыстоўвацца для будаўніцтва дымаадводных каналаў. Не саромейцеся пытаць адпаведныя дакументы, якія пацвярджаюць гэта, у прадаўцоў. Правільна абсталяваны комін мусіць быць толькі вертыкальны, без якіх-небудзь уступаў ці выгінаў, дзе можа ў вялікай колькасці адкладацца сажа. Аднак сачыць за ягоным станам, не дапускаць забівання каналаў трэба ўвесь час.

А вось з печчу ўсё значна прасцей. Калі яна складзена правільна, то правілы яе эксплуатацыі аналагічныя тым, што і ў хаце.

— Гэта значыць, сачыць за тым, каб вуголле не выпала з топкі на падлогу. І, натуральна, не перапальваць яе, што асабліва актуальна ў халады, — раіць Анастасія Швайбовіч. — Мы не раз сутыкаліся з выпадкамі, калі дровы падпальваліся пры дапамозе лёгкаўзгаральных вадкасцяў. Пажары часам узнікаюць і праз камбінацыю негатыўных фактараў. Скажам, паблізу печкі размяшчаліся гаручыя рэчывы і матэрыялы. Гаспадар прапальвае печ з адчыненымі дзверцамі. А пасля пакідае яе без нагляду ці даручае кантроль дзецям...

У абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях падзяліліся вельмі павучальнай гісторыяй. У адной з вёсак Лагойскага раёна гаспадар дачы пабудаваў новую лазню. Абсталявана яна была на найлепшым узроўні: акрамя парылкі і падсобных памяшканняў былі прадугледжаны і пакой адпачынку. Тройчы лазню ўжо прапальвалі. Рабілі гэта для таго, каб хутчэй выветрыўся пах фарбы. І вось чацвёрты раз было вырашана: час выпрабаваць новабудоўлю, як кажуць, на справе. Праз пару гадзін прапальвання з боку лазні данёсся здрадніцкі пах гару. Літровы вогнетушыцель з аўтамабіля амаль не дапамог — настолькі буйны быў пажар. Жонка гаспадара дачы тут жа выклікала ратавальнікаў. Толькі дзякуючы ім новая лазня не стала цалкам здабычай агню. Але пры гэтым рамонт ёй спатрэбіўся...

Прычынай таго пажару стала якраз сэндвіч-труба. Да таго ж да яе прымыкалі драўляныя канструкцыі даху. Па словах гаспадара лазні, ён спачатку хацеў купіць толькі печ.



Але прадавец угаварыў купіць і вось такі дымаход, які ледзь не загубіў пабудову. Ды і каштаваў ён добрых грошай...

— У сучаснай лазні крыніцай цяпла з'яўляецца кацёл. Ці ёсць нейкія асаблівыя патрабаванні да яго?

— Неабходна, каб ён быў толькі заводскага паходжання. Мантаж і эксплуатацыя — толькі ў адпаведнасці з дакументацыяй, якая ідзе разам з ім. Як правіла, яна адпавядае правілам пажарнай бяспекі, — заўважае Анастасія Швайбовіч. — Непасрэдна падчас эксплуатацыі катла трэба сачыць за тым, каб усе сістэмы кантролю былі спраўныя.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота МНС.**

# ПРЫЙДЗЕ ЧАС І ЗБІРАЦЬ КАМЯНІ

## Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала разабрацца, што можа прыпыніць знішчэнне закінутых старадаўніх будынкаў



**У Магілёве добра памятаюць краязнаўца Іераніма Філіповіча, які з вялікай пашанай ставіўся да гісторыі роднага горада і надзвычай балюча ўспрымаў рашэнні аб знішчэнні старадаўняй забудовы ў савецкі час. Пад знос ішлі храмы, купецкія дамы, адміністрацыйныя будынкі накшталт Ратушы. Сёння ў абласным краязнаўчым музеі імя Е. Раманава захоўваюцца шматлікія папкі з апісаннямі і фотаздымкамі тых славутасцяў. Так Іеранім Іосіфавіч фіксаваў сыходзячыя моманты былой прыгажосці, ратуючы іх хоць бы на паперы. А яшчэ браў цагліны ад разбураных пабудоў — імі ў музеі занята больш чым палова шафы.**

### ДОМ З ГІСТОРЫЯЙ

Калі ў пачатку студзеня я апынулася ў старадаўнім парку Слаўгарада і ўбачыла напалову знесены дом пачатку XVIII стагоддзя, застыла ў разгубленасці. Глядзела на старадаўнюю кладку будынка, пра які неаднойчы пісала, што яго трэба ратаваць, і слёзы наварочваліся на вочы. Як так? Усе ж ведалі? Чаму? — не ўкладвалася ў галаве. Сядзела на грудзе зламаных цаглін і адчайна слала эсэмэскі ўсім, ад каго, як мне здавалася, залежала прыпыненне гэтага вар'яцтва. А потым узяла, і, як той Філіповіч, ад немагчымасці нешта змяніць ды неяк паўплываць на працэс, выцягнула з-пад абломкаў цэлую з тоўстым слоем вапнавай рошчыны цагліну-пальчатку і паклала ў пакет. Хай хоць нешта застанецца на памяць.

Будынак, нягледзячы на свой паважаны ўзрост, не меў ахоўнага статусу. Хоць мясцовыя жыхары добра ведалі, што ён вельмі стары. Пра яго згадваў аўтар кнігі «Садова-паркавае мастацтва Беларусі» 1989 года выдання Анатоль Федарук, які пісаў: «тут, з супрацьлеглага боку палаца, быў пабудаваны яшчэ адзін сядзібны дом. Пабудовы злучаў падвесны мост, перакінуты цераз роў (па яго дне цяпер праходзіць дарога да прычала на рацэ Сож)». Двухпавярховікам карыстаўся князь Аляксандр Галіцын, які атрымаў гэтае мястэчка ў падарунак ад Кацярыны Вялікай за свае ратныя подзвігі. Апісанні дома пакінуў і вядомы рускі акадэмік Іван Ляпёхін, які ў пачатку 1770-х здзейсніў сваё навуковае падарожжа па новых правінцыях Расійскай імперыі: «У 1776 годзе князь (Аляксандр Галіцын. — **Аўт.**) вырашыў пабудаваць новы палац, ён уяўляў сабой двухпавярховы драўляны асабняк, абмазаны глінай. Таксама захаваўся да нашых дзён сядзібны дом, які быў злучаны з палацам перакідным мостам, уздоўж якога былі пабудаваныя паркавыя ансамблі.»



У савецкі час двухпавярховік выкарыстоўвалі пад райвыканкам і нават дабудавалі правае крыло. Працаглы час тут знаходзіліся кабінеты райспажыўкааперацыі. Памятаю, як некалькі гадоў таму яе старэйшыя супрацоўнікі расказвалі пра вытанчаную кафлю, якую яшчэ ў савецкія гады разбілі будаўнікі, калі перараблялі каміны. Пра высакародную пабудову сведчылі і вялікія, метровай шырыні, падаконнікі, высокія столі. А які прыгожы адкрыўся з вокнаў



від на парк, словамі не перадаць. Кажуць, што ў старых сценах заўсёды жыве дух дома. Магчыма, гэта ён уздыхаў і рыпеў масніцамі, калі прыбіральшчыца ў позні час наводзіла тут парадак. У пустым будынку наогул можна пачуць незвычайныя гукі. Асабліва, калі ён такі стары. Але самым таямнічым месцам быў у доме склеп. Пад ім, кажуць, знаходзіўся падземны ход. Каля напаўразбуранага будынка я сапраўды бачыла правалы грунту. Магчыма, гэта якраз ён і быў?

**Старшы навуковы супрацоўнік мясцовага гісторыка-краязнаўчага музея Вера СТАСЕНКА** прызналася, што была ў шоку ад навіны. Яна ініцыятар і арганізатар пешаходных экскурсій па Слаўгарадзе, вадзіла гасцей горада па зацверджаным Нацыянальным агенцтвам па турызме маршруце. І знесены будынак быў на ім самы цікавы аб'ект.

— Ён уключаны ў рэестр Нацыянальнага агенцтва па турызме «Архітэктурная спадчына XVIII—XIX стагоддзяў каля паштовых дарог», — удакладняе яна. — Гэта сапраўды быў унікальны аб'ект, пра які можна было вельмі доўга расказваць. Ён ідэальна падыходзіў для таго, каб зрабіць з яго так званы Дом муз і перамясціць сюды раённы цэнтр дзіцячай творчасці і дзіцячую школу мастацтваў.

Шкада, што Слаўгарад, старадаўні Прапошаск, не шануе сваёй гістарычнай асаблівасці. Горад, дарэчы, на сем гадоў старэйшы за Маскву, адзначае сёлета сваё 885-годдзе. Толькі сваім знешнім выглядам ён зусім не адпавядае такому паважанаму ўзросту.

### ПАВІНЕН БЫЦЬ СТАТУС

Цікавыя мы людзі. З аднаго боку, скардзімся, што нам няма чаго паказаць турыстам, з другога — не зберагаем тое, што засталося. Важныя з пункту гледжання культурнай спадчыны аб'екты XVIII — пачатку XX стагоддзя перыядычна знікаюць з розных прычын. На іх месцы ўзводзяць жылыя комплексы, паркоўкі, бізнес-цэнтры. Калі ў дома няма ахоўнага статусу, ён асуджаны. Яго могуць разбурыць, як у выпадку з двухпавярховікам у Слаўгарадзе, або змяніць да непазнавальнасці. Яскравы прыклад па Магілёве — гасцініца «Метраполь»: сем гадоў таму прыватнік цалкам змяніў вонкавы выгляд сціплага двухпавярховіка XIX стагоддзя. Зрабіў з яго, па сутнасці, новую велізарную пабудову, значна павялічыўшы ў вышыню і шырыню. Гэты новы груваслі аб'ект з прэтэнзіяй на даўніну амаль цалкам засланіў сабой сапраўдную магілёўскую цікавінку — Касцёл Святога Станіслава, помнік архітэктуры барока XVIII стагоддзя.

— Мы спрабавалі адстаяць двухпавярховік, але ён быў без статусу, і нічога не атрымалася, — перажывае **магілёўскі гісторык Мікалай БАРЫСЕНКА**, які раней узначальваў у горадзе грамадскую арганізацыю ахоўы помнікаў гісторыі і культуры. — У выніку ў цэнтры горада з'явілася пабудова, не характэрная для тутэйшай архітэктуры, якая да таго ж яшчэ і не ўпісваецца ў агульны стыль.

— Дзяржава ніколі не ўмешваецца ў справы тых, хто распараджаецца гістарычнай маёмасцю без статусу, — рэзюмуе **старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон АСТАПОВІЧ.** — Тут няма ніякай юрыдычнай падставы караць. Зносіцца або перарабляецца толькі тое, што не мае статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. А каб такі статус з'явіўся, трэба каб ад кагосьці сыходзіла ініцыятыва. Патрэбная воля асобнага чалавека. Механізм надання будынку статусу прыводзіцца ў Кодэксе аб культуры. Па сутнасці, любы можа ўнікнуць і разабрацца. Усе войкаюць, што каштоўны будынак разбураюць, але ніхто нічога не робіць, каб ён атрымаў статус і знаходзіўся пад аховай дзяржавы. Толькі гэта яго ратуе ад руйнавання. Тут вінаватыя ўсе — і мясцовыя органы ўлады, і музейшчыкі, і краязнаўцы, і мясцовыя жыхары, і наша Таварыства аховы помнікаў, таму што мы фізічна не можам усюды паспець. Праблема вельмі вялікая. Калі стары будынак без статусу страчвае ўласніка або становіцца яму непатрэбным, ён пачынае дэградаваць, і мясцовым органам улады сапраўды лягчэй ад яго пазбавіцца, чым прымаць нейкія меры.

Ёсць яшчэ адна не менш актуальная праблема. Нават калі ў будынка ёсць ахоўны статус, гэта толькі палова справы. Ён, канешне, ратуе ад знішчэння, але не гарантуе яго захаванасці. З моманту прызнання будынка аб'ектам культурнай спадчыны на яго ўласніка накладваюцца абавязацельствы па ахове. Такія дамы часта маюць патрэбу ў рэстаўрацыі і рамонце. І нават калі ў дзяржавы знаходзяцца грошы на аднаўленне, яны чамусьці не заўсёды даходзяць да аб'екта. Прыклад — той жа Слаўгарад, дзе яшчэ ў савецкі час двойчы былі спробы здыць з царквы Прасвятой Багародзіцы, помніка архітэктуры XVIII стагоддзя, музей рэлігіі рэспубліканскага, а то і саюзнага маштабу. Тады яшчэ вельмі добра выглядалі фрэскі вучняў вялікага мастака Уладзіміра Баравікоўскага, якімі размалёваны сцены і купал храма. Праекты так і ляжаць у аддзеле культуры Слаўгарадскага райвыканкама. А вось што датычыцца фінансаў, даведацца пра іх складаней. Некаторыя жыхары горада выказваюць здагадкі, што на іх быў пабудаваны раённы дом культуры. Дарэчы, нешта падобнае атрымалася і з яшчэ адным гістарычным аб'ектам у Слаўгарадзе — паштовай станцыяй XIX стагоддзя. Планавалася, што там размесціцца раённы гісторыка-краязнаўчы музей. Музей з'явіўся, але не ў гістарычным будынку, а за ім — спехам пабудаванай бетоннай каробцы. І зараз яшчэ не кожны турыст з першай спробы здагадаецца, дзе яго шукаць. А паштовая станцыя, якая ўжо як мінімум 15 гадоў чакае рамонту, працягвае разбурацца.

### ЯК БУДЗЕМ РАТАВАЦЬ?

Гэтым заклапочаны гісторыкі, краязнаўцы, работнікі культуры, грамадскасць не толькі Магілёўскай вобласці.

— На жаль, мы вельмі абмежаваныя ў грашовых сродках, — заўважае **галоўны спецыяліст упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Яўген БЕЛАВУСАЎ.** — Усяго па Магілёўскай вобласці 129 помнікаў архітэктуры, у тым ліку з комплексамі, у якія ўваходзіць адразу некалькі будынкаў. Сёлета фінансаванне па дзяржаўнай лініі будзе выдзяляцца толькі на рэканструкцыю Жылiцкага палацава-паркавага ансамбля. Што датычыцца іншых аб'ектаў, то грошы на іх знайсці цяжэй. І ў невялікіх райцэнтрах, і ў больш буйных гарадах прапрацоўваюцца пытанні па спонсарскай дапамозе, па прыцягненні сродкаў з пазабюджэтных крыніц, не забароненых заканадаўствам. Там, дзе абстаноўка зусім крытычная, ствараюцца дабрачынныя рахункі, каб да справы маглі далучыцца ўсе ахвотныя.

Падчас дыскусій на дыялогавых пляцоўках, дзе абмяркоўваліся прапановы для ўнясення ў заканадаўства, гучалі розныя меркаванні, як ратаваць нашу гісторыка-культурную спадчыну. У рэзалюцыю для разгляду на найвышэйшым узроўні Магілёўскі аблвыканкам унёс некалькі з іх. Ёсць, напрыклад, прапанова прадугледзець адлічэнні ад продажу білетаў на культурна-відовішчныя мерапрыемствы, якія магчыма было б накіроўваць на рэканструкцыю гісторыка-культурных аб'ектаў. Некаторыя прапануюць ісці нават далей.

— Я бачу толькі адзін спосаб захаваць нашу культурную спадчыну — гэта ўвесці адлічэнні ў памеры 0,5-1 % ад прыбытку для ўсіх нашых камерцыйных і дзяржаўных арганізацый і прадпрыемстваў, — перакананы Мікалай Барысенка. — У іншым выпадку мы проста страцім нашу гістарычную спадчыну. Аб'ектаў у занядбаным стане па вобласці шмат. Касцёлы ў Княжыцах і Расне, закінутая сядзіба Талстых у вёсцы Грудзінаўка Быхаўскага раёна, той жа Быхаўскі замак — адзіная такога кшталту пабудова на ўсю краіну. А яшчэ было б добра, калі б на ўзроўні Міністэрства культуры быў створаны нарматыўны акт, які б падштурхнуў нашы музеі і ўстановы культуры абследаваць усе будынкі і падрыхтаваць неабходныя матэрыялы для прысваення ім статусу. Няхай яны будуць трэцяй катэгорыі або зусім без катэгорыі, але сэнс усяго гэтага — зберагчы. У іншым выпадку мы страцім усе помнікі і XIX стагоддзя, і савецкай эпохі. А без гісторыі, без надзейнага падмурка немагчыма будаваць дзяржаву. Архітэктура — гэта застылая ў камені даўніна, а мы ад яе пазбаўляемся. І гэтым толькі сваіх нашчадкаў абдзяляем.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота аўтара і з архіва Веры СТАСЕНКІ.**




# Штрыхі да калектыўнага партрэта

Людзі, фота якіх вы бачыце ў сённяшнім выпуску нашай рубрыкі, ужо заўтра ў сталічным Палацы рэспублікі разам з іншымі дэлегатамі VI Усебеларускага народнага сходу будуць вырашаць важныя для краіны пытанні. Жывуць яны ў розных рэгіёнах нашай Радзімы, працуюць у розных сферах, кожны мае свой жыццёвы досвед і ўласныя погляды на жыццё. Іх яднае менавіта званне дэлегатаў сходу і той давер, які аказалі калегі і землякі, абраўшы прадстаўнікамі на народны форум, — а яшчэ, напэўна, жаданне гэты давер апраўдаць. Як яны робяць штодня — там, дзе жывуць і працуюць.

**Фота БелТА.**



Алег ЯДРАНЦАЎ, галоўны ўрач Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 1.



Ліліяна СТРЭЛЬСКАЯ, загадчыца дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці № 26 г. Мінска.



Аляксандра УРБАНОВІЧ, інструктар-метадыст спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 2 г. Ліды.



Людміла САХОНЕНКА, швачка ЗАТ «Аршанская прамыслова-гандлёвая фірма «Світанак».



Аляксандр КАНАВАЛАЎ, кіраўнік фермерскай гаспадаркі «Новы быт» Шклоўскага раёна.



Мікалай МАЧАНСКІ, начальнік Мінскага аэраклуба ДТСААФ.



Вольга ГАПОНІК, апрацоўшчыца рыбы і морапрадуктаў рыбнага цэха філіяла Івацэвіцкага райспажыўтаварыства, шматдзетная маці, цяпер у дэкрэтным водпуску.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:**

- капитальное строение, инв. № 400/С-17193 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – главный производственный корпус), площадью 29971,7 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, состоящее из капитального строения, инв. № 400/D-152212 (назначение – производственное помещение, наименование – главный производственный корпус), площадью 29418,5 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-2 и капитального строения, инв. № 400/D-123114 (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения), площадью 523,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-1; капитальное строение, инв. № 400/С-69015 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – автоматическая насосная станция пожаротушения), площадью 160,5 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/2; капитальное строение, инв. № 400/С-69014 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – КПП-120), площадью 19,6 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/1; капитальное строение, инв. № 400/С-97344 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 7950,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, благоустройство территории для обслуживания зданий и сооружений главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-86338 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – резервуар для хранения 8 % раствора пенообразователя), объемом 250,0 куб. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-58965 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 1000 куб. м), объемом 1000 куб. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-89988 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – площадка под емкости), площадью застройки 119,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г; капитальное строение, инв. № 400/С-85888 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 586,05 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-97346 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 325,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-89982 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1940,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-97338 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1189,75 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-89983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная напорная канализация), протяженностью 243,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-55845 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внеплощадочная кабельная линия, напряжением 10 кВ), протяженностью 1018 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-74384 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – внутриплощадочная телефонная канализация), протяженностью 193,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-121799 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 206,65 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, водопроводная сеть от врезки до КНС, здания насосной станции и производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-74876 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 227,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-74877 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 991,36 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-97384 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 420,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения зданий и сооружений главного производственного корпуса; Капитальное строение, инв. № 400/С-97380 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 353,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса; капитальное строение, инв. № 400/С-97392 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ), протяженностью 473,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10 кВ до ТП-1, от ТП-1 до ТП-2; капитальное строение, инв. № 400/С-55838 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная напорная канализация), протяженностью 277,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-55842 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный производственный водопровод), протяженностью 1305,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; капитальное строение, инв. № 400/С-85887 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – мостовое сооружение), протяженностью 48,00 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ марки ААБл3*95 протяженностью 155 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; внутриплощадочная кабельная линия 0,4 кВ марки АВБбШв протяженностью 70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; пункты и шкафы распределительные – 68 единиц; камера КСО-272 – 5 единиц; трансформаторная подстанция – 3 единицы; панель ЩО-7024; трансформатор масляный – 6 единиц; трансформаторные ячейки КРУ-821-00848 – 2 единицы; вентилятор центробежный – 7 единиц; камера орошения – 7 единиц; кондиционер – 6 единиц; бункер пылеулавливающий – 8 единиц; дизель-генератор ДГА-3-48; туя – 3 единицы; липа – 4 единицы.

| |
|---|
